ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

17 ЖНІЎНЯ 2017 г. ЧАЦВЕР №157 (28521)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Маладзёжныя «тысячнікі» ў полі**



**Спрынт на тралейбусе**



**Анатаміраванне пакажа**

СТАР. 14

*ЛІЧБА ДНЯ*

**2 288 858 пасажыраў**

*абслужыў сёлета ў студзені—ліпені Нацыянальны аэрапорт Мінск. Гэта на 25% вышэй за паказчык мінулага года. За сем месяцаў 2017 года абслужана 13 842 самалётавылеты (на 8,4% больш, чым летась). Таксама аэрапорт падвёў вынікі вытворчай дзейнасці за ліпень. За гэты месяц абслужана 495 778 пасажыраў (прырост склаў 18,4%) і 2388 самалётавылетаў (на 4,1% больш у параўнанні з аналагічным перыядам 2016 года).*

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 28° |
| Віцебск | + 26° |
| Гомель | + 30° |
| Гродна | + 25° |
| Магілёў | + 27° |
| Мінск | + 26° |

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 17.08.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9450 | ▼ |
| Еўра | 2,2831 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0326 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0760 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# ПРЫ ПОЎНЫМ ПАРАДЗЕ



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

**1 верасня Улад УЗГАРОК пойдзе ўжо ў 6 клас. Таму да выбару канцылярскіх тавараў ставіцца лёгка.**
**— Бяром гэта? — пытаецца мама Наталля Леанідаўна, і сын адразу ж пагаджаецца.**
**Па апошнія пакупкі яны завіталі на школьны базар каля Цэнтральнага ўнівермага ў Смалявічах. Падрыхтоўвала да школы Улада сям'я ў некалькі «этапаў»: спачатку адзенне і абутак, пасля — сшыткі, ручкі, алоўкі. І заплечнік.**
**Дарэчы, каля ўнівермага смалявіцкія валанцёры Чырвонага Крыжа праводзяць акцыю «У школу разам!» Усе ахвотныя могуць набыць усё неабходнае не толькі сабе, але і дзеткам, што засталіся без бацькоў. Смалявічы актыўна прымаюць удзел, бо добра знаёмыя з гэтай акцыяй — праводзіцца яна ўжо чацвёрты год.**

■ Акцэнт на здароўе

## ДЗЕ ЛЕТА, ТАМ ІНФЕКЦЫІ

### Якія з іх беларусы прывезлі з-за мяжы, а якіх пазбеглі дзякуючы вакцынацыі

**Выпадкі дыфтэрыі, слупняку, поліяміэліту, краснухі і вострага гепатыту В у дзяцей сёлета не рэгістраваліся. Папярэджваюцца такія інфекцыі з дапамогай вакцын, а вось там, дзе ахоп прафілактычнымі прышчэпкамі не дасягае высокага ўзроўню, такіх дасягненняў няма. Ва Украіне, напрыклад, сёлета зарэгістравана 5 выпадкаў слупняку, у тым ліку ў дзяцей. Калі працэнт вакцынаваных знізіцца і ў нас, то адразу вернуцца і інфекцыі.**



У Беларусі зарэгістраваны пакуль толькі адзін выпадак АДРУ, і тое завезенага. Тым часам больш за 14 тысяч выпадкаў з пачатку года зарэгістравана ў еўрапейскіх краінах. Найбольшая колькасць у Румыніі, Італіі і Германіі. Большасць беларусаў абаронены ад адру, тым не менш пацікавіцца сваім статусам, наяўнасцю дзвюх прышчэпак ад гэтай інфекцыі можна ў паліклініцы (пачынаючы з шасці гадоў). Калі раптам тут «прабел», пажадана прышчапіцца эфектыўным прэпаратам, які абараняе адразу ад трох інфекцый — адру, краснухі і эпідэмічнага паратыту.

Дарэчы, у краіне зафіксаваны сёлета тры выпадкі ЭПІДПАРАТЫТУ, адзін з якіх завезены. На КОКЛЮШ захварэла звыш 200 чалавек, галоўным чынам, дзяцей (такая сітуацыя назіралася і летась). Усе яны — непрышчэпленыя або абарона яшчэ не паспела сфарміравацца, або час вакцынацыі быў з нейкай прычыны пасунуты. Найбольш цяжкія выпадкі ўзнікаюць у дзяцей да аднаго года, а таксама ў тых, каму яшчэ няма трох гадоў, калі пасля прыступу кашлю ўзнікаюць перыяды прыпынення дыхання, развіваюцца запаленне лёгкіх, сутаргі, энцэфалапатыя і інш. І тут таксама дзяржава прапануе вакцыну, правераную часам і досыць эфектыўную.

СТАР. 4

■ Жніво-2017

## У фермераў уборка ідзе сваім парадкам

**Фермерская гаспадарка «Фартуна» Галіны і Сяргея МАТУСАЎ з Баранавіцкага раёна толькі распачала масавую ўборку ўраджаю.**

— Дала аб сабе ведаць позняя вясна, ды і не зусім звычайнае лета, — гаворыць кіраўнік гаспадаркі Галіна Матус. — А ў нас яравая пшаніца. Таму і прыступілі да скошвання і абмалоту пазней. Але на ўраджайнасці гэта ніяк не адаб'ецца. Колас выспеў добры, пакуль з кожнага гектара збіраем крыху больш за 50 цэнтнераў збожжа. Пад пшаніцу сёлета мы адвялі 200 гектараў. У нас ёсць збожжаўборачны камбайн, які за дзень намалочвае ад 100 да 140 тон. Так што пакуль уборка радуе. Пасля пшаніцы прыступім да ўборкі кармавых бабоў, яны паспяваюць на 100 гектарах. А потым надыдзе чарга «другога хлеба».

Збожжавыя і бабы «Фартуна» вырошчвае найбольш для севазвароту. Асноўныя культуры гаспадаркі гэта бульба, агародніна, якую фермеры прадаюць як у сырым, так і перапрацаваным выглядзе. Цяпер па плошчы фермерская гаспадарка не ўступае сярэдняму калгасу, яна мае 1000 гектараў зямлі, свой тэхнічны парк, калектыў работнікаў колькасцю каля 60 чалавек. А пачыналася «Фартуна» больш чым дваццаць гадоў таму з двух гектараў зямлі. Цяпер гэта сельскагаспадарчае прадпрыемства, якое ўстойліва развіваецца. Летась, напрыклад, узялі ў штат на пастаяннай аснове галоўнага агранома. Таму Галіна Матус асабліва не заклапочаная тэмпамі і тэрмінамі ўборкі, яна цалкам давярае спецыялісту.

— Мой добры знаёмы, дацкі фермер сказаў: «Прырода ніколі пад нас не падладзіцца, таму нічога не застаецца, як падладжвацца пад яе». Не страшна, што мы пачалі ўборку крыху пазней, ёсць усе падставы спадзявацца, што паспяхова яе закончым, — разважае Галіна Матус.

Калі буйная гаспадарка Баранавіцкага раёна ўбірае першую палову плошчаў збожжавых, то прыватныя гаспадары з Кобрынскага раёна ў справе жніва падыходзяць да завяршэння. Паводле слоў **намесніка старшыні Кобрынскага райвыканкама Сяргея БАРТАША**, у раёне зарэгістравана 16 сялянска-фермерскіх гаспадарак, адзінаццаць з іх займаюцца раслінаводствам. Амаль усе паспяхова справіліся з уборкай збожжавых альбо вядуць абмалот на апошніх гектарах сваіх палеткаў.

СТАР. 4

# АД ПРАЕКТАЎ ДА КАНКРЭТЫКІ

## У Палацы Незалежнасці прайшлі перагаворы з кіраўніком урада Афганістана

**Важна памятаць сваю гісторыю. Але гэтак жа важна ісці наперад — асабліва дзяржавам, народам. Тым больш калі перспектывы для развіцця супрацоўніцтва ёсць. На гэтым зрабіў акцэнт кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка падчас сустрэчы з кіраўніком выканаўчай улады Афганістана Абдулой Абдулой, які з афіцыйным візітам знаходзіцца ў нашай краіне.**

— Нягледзячы на тое, што мы мелі кантакты, у тым ліку і я, з высокімі службовымі асобамі Афганістана да вашага візіту, тым не менш я ўпэўнены, што гэты візіт адкрые новую старонку супрацоўніцтва нашых дзяржаў, — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Ён падкрэсліў, што Беларусь — выключна міралюбівая краіна:

— Тым не менш я адчуваю нейкую сваю адказнасць, калі хочаце віну, у тым, што сення адбываецца ў Афганістане. Так склалася гісторыя адносін у часы Савецкага Саюза з іншымі дзяржавамі планеты, у тым ліку з Афганістанам. Мы, як складальная частка, рэспубліка Савецкага Саюза, нясём, безумоўна, адказнасць за тое, што адбывалася ў тыя часы ў Афганістане. Гэта адказнасць не толькі Савецкага Саюза. У большай ступені гэта адказнасць і іншых краін — вы іх добра ведаеце.

Прэзідэнт Беларусі прызнаўся, што не прыхільнік таго, каб забываць гісторыю.

— Але і пакутаваць пастаянна па тых працэсах, якія адбываліся ў гісторыі, відаць, будзе няправільна, — лічыць ён. — Трэба выбудоўваць адносіны. Рабіць усё, каб у будучыні нашы адносіны былі цудоўнымі, і каб нам не было сорамна глядзець адно аднаму ў вочы.

Аляксандр Лукашэнка запэўніў замежнага госця, што беларускі ўрад будзе рабіць усё для таго, каб выбудаваць фундамент адносін з Афганістанам, напоўніць супрацоўніцтва канкрэтным зместам, перайсці ад пажаданняў, размоў да канкрэтных дзеянняў. Беларускі лідар заявіў, што Беларусь да гэтага гатовая.

— Я хачу, каб падчас свайго візіту вы пазнаёміліся з нашымі магчымасцямі, — прызнаўся ён. — Хачу вас запэўніць: усё, што вас будзе цікавіць, а мы ў сваю чаргу зможам гэта зрабіць, — мы абавязкова зробім. Мы можам зрабіць гэта з удзелам трэціх краін. Скажу шчыра, мы вельмі часта, сустракаючыся з Прэзідэнтам Туркменістана, абмяркоўвалі тэму Афганістана і кірункі сумеснага супрацоўніцтва. Я яго прасіў, каб ён дапамог мне ўстанавіць з кіраўніцтвам Афганістана адносіны, каб мы зрушыліся з мёртвага пункта.

Карыстаючыся выпадкам, Прэзідэнт павіншаваў Абдулу Абдулу з галоўным святам Афганістана — Днём Незалежнасці.

Абдула Абдула падзякаваў за цёплы прыём. Ён прызнаўся, што гэты візіт вельмі карысны і важны для афганскага боку. «Наш урад, наш народ поўныя рашучасці наноў перабудаваць сваю дзяржаву — як у галіне асветніцтва, так і аховы здароўя, сельскай гаспадаркі», — паведаміў Абдула Абдула. Ён звярнуў увагу, што ўнёсак Беларусі ва ўрэгуляванне сітуацыі ў рэгіёне, на яго думку, гэта — значная, істотная рэч.

Афганістан у першую чаргу зацікаўлены ў супрацоўніцтве ў галіне сельскай гаспадаркі, прамысловасці, здабычы карысных выкапняў, адукацыі.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

# Калі сніцца трава каля дома...

## Прэзідэнт сустрэўся з касманаўтам, што нарадзіўся на Міншчыне

**У савецкія часы большасць хлопчыкаў марылі стаць касманаўтамі. Але з часам нехта выбраў сабе іншую прафесію, хтосьці забыўся пра дзіцячую мару, нехта не прайшоў па стане здароўя або не змог паступіць у авіяцыйнае вучылішча... А вось лётчык-касманаўт Расійскай Федэрацыі Алег Навіцкі родам з горада Чэрвеня Мінскай вобласці прайшоў няпросты шлях і вытрымаў усе выпрабаванні. Учора з ім сустрэўся кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка.**

Алег Навіцкі прыехаў на радзіму ў адпачынак — да канца жніўня. Кіраўніку дзяржавы ён прывёз у падарунак фотаздымак свайго міжнароднага экіпажа, а таксама гадзіннік — з тых, што выдаюцца касманаўтам для палёту. Яны сертыфікаваны для выхаду ў адкрыты космас. Прэзідэнт у адказ падарыў пакуль адзіны экзэмпляр кнігі пра Палац Незалежнасці.

— Гэта першы ўнікальны гістарычны ўзор, — сказаў кіраўнік краіны, уручаючы кнігу. — Гэта вартая кніжка, як я лічу. Таму няхай яна будзе ў цябе — першы асобнік, які я зацвярджаў як узор. Два словы я там напісаў на хуткую руку. Пачытаеш. Гэта такая пампезная кніжка. Каму, калі не самаму сапраўднаму чалавеку з беларускім сэрцам, падарыць гэтую першую кніжку. Гэта будзе сімвалічна і годна.

Алег Навіцкі мае ў сваім паслужным спісе два палёты ў космас. У цэлым ён правёў там без малога год!

— Назіралі, перажывалі, — прызнаўся кіраўнік краіны. — Усё ж такі першы палёт, я так разумею, каля 150 дзён, амаль 200 дзён — наступны палёт. Мне складана гэта ўявіць... Мы назіралі, бачылі гэтыя ўсе перыпетыі, усе гэтыя праблемы.

Атмасфера сустрэчы была вельмі душэўная. Размова Прэзідэнта з касманаўтам цягнулася гадзіны дзве. Як расказаў потым журналістам Алег Навіцкі, было закранута вельмі шмат пытанняў, звязаных з касманаўтыкай, з роляй Беларусі як касмічнай дзяржавы, гутарылі пра даследаванне Зямлі з космасу, пра патрыятызм і выхаванне дзяцей... Касманаўт прызнаўся, што гэта яго другая сустрэча з беларускім лідарам. Ён таксама расказаў, што хоча жыць на радзіме і плануе заняцца будаўніцтвам прыватнага дома тут, у Беларусі.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

## Самы гарачы за ўсю гісторыю назіранняў: ліпень-2017 устанавіў новы рэкорд

Мінулы ліпень стаў самым цёплым месяцам за ўсю гісторыю метэаназіранняў, пачынаючы з 1880 года. Тэмпература ў гэтым месяцы перавысіла сярэдняліпеньскую на 0,83 °С і пабіла рэкорд ліпеня 2016 года, паведамляе Інстытут касмічных назіранняў НАСА.

Прааналізаваўшы даныя 6300 метэаралагічных станцый па ўсім свеце, а таксама прыбораў на суднах і буях, якія вымяраюць тэмпературу паверхні мора, і антарктычных даследчых станцый, спецыялісты ўстанавілі, што тэмпература ў ліпені на 0,83 °С перавысіла сярэдні паказчык 1951—1980 гадоў. Раней паведамлялася, што мінулы, 2016 год, аказаўся самым цёплым за 137 гадоў назіранняў.

Як гаворыцца ў дакладзе Нацыянальнай адміністрацыі па даследаванні акіянаў і атмасферы ЗША, большасць паказчыкаў змянення клімату працягваюць «прытрымлівацца тэндэнцыі пацяплення». Канцэнтрацыя парніковых газаў у атмасферы ў 2016 годзе таксама дасягнула рэкорднага ўзроўню ў гісторыі.

Узровень мора падняўся на 82 мм, таксама ўстанавіўшы рэкорд з 1993 года, калі пачаліся назіранні за гэтым паказчыкам.

## Трамп выступіў супраць зносу помнікаў



Прэзідэнт ЗША Дональд Трамп выказаўся супраць зносу помнікаў, а таксама абвінавачыў СМІ ў спробах змяніць гісторыю. З такімі заявамі, як перадае РІА «Навіны», ён выступіў у Нью-Ёрку.

«Сёння знясуць [помнік генерала Канфедэрацыі падчас Грамадзянскай вайны] Стоўнуала Джэксана, а заўтра гэта будзе помнік [заснавальнікаў ЗША] Джорджа Вашынгтона або Томаса Джэферсана? Трэба задаць пытаннем — дзе гэта ўсё закончыцца», — падкрэсліў Трамп.

Звяртаючыся да журналістаў, Трамп заявіў: «Вы змяняеце гісторыю і культуру!» Таксама ён зноў выказаў пункт гледжання, што ў супрацьстаянні вакол помнікаў, якое абвастрылася, вінаватыя абодва канфліктныя бакі.

Напярэдадні ў Дарэме ўдзельнікі акцыі пратэсту перакулілі помнік войскам Канфедэрацыі. Помнік салдату часоў Грамадзянскай вайны ў ЗША, усталяваны ў 1924 годзе, знаходзіўся перад будынкам мясцовага муніцыпалітэта.

12 жніўня ў Шарлотсвілі, штат Вірджынія, неанацысты правялі стыхійнае факельнае шэсце, патрабуючы ад мясцовых уладаў адмовіцца ад зносу помніка генералу канфедэратаў Роберту Эдварду Лі. Пасля гэтага ў горадзе ўспыхнулі беспарадкі, у якіх пацярпелі 15 чалавек.

Пазней на шэсці супраць акцыі ўльтраправых у натоўп на вялікай хуткасці заехаў аўтамабіль. У выніку загінуў адзін чалавек, яшчэ 19 атрымалі раненні. У той жа дзень на ўскраіне горада ўпаў паліцэйскі верталёт, загінулі два чалавекі. Уляды звязалі крушэнне з падзеямі, якія адбыліся раней.

## Больш як 600 чалавек зніклі без вестак у Сьера-Леонэ пасля сходу апоўзня

У Сьера-Леонэ пасля сходу апоўзня 600 чалавек лічацца зніклымі без вестак, паведамляюць інфармагенцтвы са спасылкай на мясцовую арганізацыю Чырвонага Крыжа.

Паводле апошніх звестак, колькасць загінулых дасягнула 350. Целы людзей выносіць хвалямі на пляж Фрытаўна. Пошукава-выратавальная аперацыя працягваецца. З патэнцыйна небяспечных раёнаў праводзіцца эвакуацыя людзей. Сход апоўзня адбыўся раніцай 14 жніўня ў прыгарадзе сталіцы. Мноства дамоў апынуліся пад заваламі.

## КАРЫСНАЯ ТЭЛЕФОННАЯ СУВЯЗЬ

**Аблвыканкамы і Мінгарвыканкам 19 жніўня ў суботу правядуць чарговыя прамыя лініі. З 9.00 да 12.00 на званкі жыхароў краіны будуць адказваць:**

намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама КЛЕЦ Андрэй Анатолевіч, тэл. 8 (016) 2213121;

намеснік старшыні ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама АСКЕРКА Віктар Віталевіч, тэл. 8 (021) 2222222;

кіраўнік спраў ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама КЛІЧКОЎСКАЯ Алена Уладзіміраўна, тэл. 8 (023) 2751237;

кіраўнік спраў ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама ПАПОЎ Ігар Андрэевіч, тэл. 8 (015) 2735644;

намеснік старшыні МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама КУНЦЭВІЧ Андрэй Міхайлавіч, тэл. 8 (022) 2501869;

першы намеснік старшыні МІНСКАГА аблвыканкама МАКАР Ігар Мікалаевіч, тэл. 8 (017) 5004160;

намеснік старшыні МІНСКАГА гарвыканкама ЛАПЦЕЎ Віктар Сяргеевіч, тэл. 8 (017) 2224444.

■ Меркаванне



# У АКТЫЎНЫМ ПОШУКУ

## Перспектывы развіцця адносін з Польшчай

**Нягледзячы на членства Польшчы ў НАТА, пазітыўнае развіццё адносін паміж Беларуссю і Польшчай цалкам магчымае, як паказвае прыклад беларуска-турэцкага ўзаемадзеяння. Апошняе знаходзіцца на вельмі высокім узроўні, паколькі стаўка робіцца на пошук таго, што збліжае, а не таго, што падзяляе. Пераход да такога імператыва ў беларуска-польскіх адносінах мог бы пацягнуць падобныя пазітыўныя наступствы.**

Актывізацыя адносін з Польшчай — рэч, без сумневу, важная. Польшча — адзін з пяці суседзяў Беларусі, адзін з трох найбольш буйных рынкаў, а па памеры і ёмістасці эканомікі гэта і зусім нумар два з усіх суседзяў Беларусі.

Калі, напрыклад, з украінскім рынкам, які нашмат меншы за польскі, у нашай краіны ўсталяваны вельмі плённыя адносіны (у прыватнасці, у мінулым годзе мы адправілі туды на 2 мільярды 800 з лішнім мільёнаў долараў ЗША прадукцыі), то з Польшчай, на жаль, гэты паказчык у тры з лішнім разы меншы. Пры гэтым калі з Украінай у нас станоўчае сальда гандлю, то з Польшчай яно апошнія гады адмоўнае. Мець усяго 2—3 працэнты свайго тавараабароту з такой эканомікай, як Польшча, для Беларусі вельмі мала. Гэта ўпушчаныя магчымасці для бізнесменаў абедзвюх краін.

Неабходна развіваць інвестыцыйнае супрацоўніцтва. Цяперашнія аб'ёмы польскіх інвестыцый у Беларусь у памеры 150—200 мільёнаў долараў на год не адпавядаюць патэнцыялу беларускай эканомікі. Гэта крыху больш, чым штогод укладвае ў беларускую эканоміку Літва з насельніцтвам у тры мільёны чалавек. Гэта ж датычыцца і інвестыцый з боку самых багатых людзей. Амаль дзве трацiны самых багатых літоўскіх бізнесменаў з 30 ужо рэалізуюць свае бізнес-праекты ў Беларусі. У той жа час большасць багатых людзей Польшчы нават не падазраюць пра такую магчымасць.

Параўнальна мала польскіх прадпрыемстваў прыйшло ў Беларусь. Вядома, наяўнасць 350 польскіх кампаній у Беларусі першапачаткова здаецца добрай лічбай. Але толькі пакуль не паглядзіш, што Латвія з двухмільённым насельніцтвам зарэгістравала на беларускай тэрыторыі больш за 650 сваіх прадпрыемстваў.

Польшча — перспектыўная краіна, якая ў часы эканамічных праблем (як ва Украіне, так і ў Расіі), што прыносяць шмат непрыемнасцяў і для нас, — суседні рынак, які нам дастаткова добра знаёмы і на які трэба настройвацца для больш сур'ёзнай работы.

Важную ролю ў актывізацыі адносін адыгрываюць парламенты дзвюх краін. Парламенцкія кантакты дазваляюць наладжваць як палітычнае супрацоўніцтва (гэта рэч пастаянна важная), так і эканамічнае ўзаемадзеянне, паколькі парламенты і Беларусі, і Польшчы працуюць у цесным кантакце з бізнес-коламі. І вельмі часта актывізацыя палітычных кантактаў цягне за сабой розныя ідэі па развіцці кантактаў эканамічных. Бо, не сакрэт, дэпутаты як польскага, так і беларускага парламентаў прымаюць удзел у розных эканамічных мерапрыемствах, расказваюць адно аднаму навіны з суседняй краіны. І гэта значыць, што чым больш інтэнсіўныя кантакты, тым большая колькасць польскіх прадпрымальнікаў і польскага кіраўніцтва ў эканамічным блоку будзе цікавіцца інвестываннем у розныя праекты на тэрыторыі Беларусі, арганізацыяй сумесных прадпрыемстваў, абменам або развіццём тэхналогій.

Такім чынам, палітычнае вымярэнне парламенцкіх кантактаў непазбежна пацягне за сабой і эканамічнае вымярэнне, што сапраўды надзвычай важна ў цяперашняй эканамічнай сітуацыі ў нашым рэгіёне.

Што немалаважна, Польшча — гэта выхад і на нямецкі рынак, самы буйны ў Еўрапейскім саюзе (дарэчы, аднačасова і самы канкурэнтны). Польшча — гэта бяспошлінная ўнутраная прастора Еўрапейскага саюза, таму і сумесныя прадпрыемствы на яе тэрыторыі, напрыклад, створаныя беларускімі прадпрымальнікамі, — гэта выдатны спосаб пранікаць са сваім таварам з нашымі камплектуючымі на самы ёмкі рынак Еўрапейскага саюза — у Германію.

У апошнія дзесяцігоддзі Германія прыўнесла тысячы найноўшых тэхналогій на тэрыторыю Польшчы, стварыла там нямала сумесных прадпрыемстваў. Іх досвед важны, паколькі гэта досвед перадавых заходніх прадпрыемстваў высокатэхналагічнай нямецкай эканомікі.

Сёння Польшча — гэта краіна, як і Беларусь, з пераходнай эканомікай, якая мае шматлікія аспекты планавай, а цяпер развівае рынкавую, закліканую вырашыць розныя праблемы ў плане інвестыцыйнай прывабнасці дзяржавы і рынкавай сістэмы, у мадэрнізацыі, стварэнні працоўных месцаў.

А ўсё гэта значыць, што ў цэлым Польшча — краіна нам зразумелая, тут спалучаюцца звыклыя нам спосабы і метады работы з самымі сучаснымі тэхналогіямі перадавой эканомікі, прыўнесенымі са «Старой Еўропы». І, вядома ж, больш цесныя кантакты Беларусі з Польшчай могуць прынесці нам дывідэнды ў гэтай сферы, дадуць магчымасць мадэрнізаваць уласную эканоміку.

**Сяргей КІЗІМА, доктар палітычных навук** ■

■ Камунальныя стасункі

# ШТО ПАВЯЛІЧВАЕЦЦА І ПАМЯНШАЕЦЦА Ў ЖКГ



**Службы 115 з'явяцца па ўсёй Беларусі, а аб'ёмы капітальнага рамонту жылля павялічацца. Пра гэтыя і іншыя моманты работы жыллёва-камунальнай гаспадаркі расказалі спецыялісты Міністэрства ЖКГ.**

### 2,5 млн «квадратаў» — для капрамонту

Сёлета Мінжылкамгас плануе капітальна адрамантаваць больш за 2,5 млн квадратных метраў жылля і зрабіць гэта «ў поўным аб'ёме, з належнай якасцю і ва ўстаноўлены тэрмін», запэўніў **Дзмітрый КАЗАНОЎСКІ, начальнік упраўлення эканомікі Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі**. Такая лічба азначае выхад на запланаваны на гэты год аб'ём капрамонту ў 2,3% (яшчэ ў 2010-м за год рамантаваўся толькі 1% ад усёй эксплуатаванай плошчы жылля ў Беларусі). Згодна ж з дзяржаўнай праграмай «Камфортнае жыллё і спрыяльнае асяроддзе» аб'ёмы капрамонту да 2020 года павінны дасягнуць 3% у год.

За першае паўгоддзе бягучага года падчас капрамонту заменена 275 ліфтаў. Каля 97 тысяч састарэлага асвятляльнага абсталявання заменена энергаэфектыўным. Адрамантавана 4 тысячы 314 пад'ездаў.

Акрамя таго, сем'і, у якіх на аплату жыллёва-камунальных паслуг у горадзе прыходзіцца 20% даходу, а ў сяле — 15%, атрымалі за паўгоддзе 330 тысяч рублёў безнаяўных жыллёвых субсідый. Гэтая сума была падзелена паміж 11 тысячамі чалавек.

— Субсідыі ў памеры 15 рублёў атрымала каля 6,6 тыс. чалавек, астатнім выдзелена больш за 15 рублёў. А ў сярэднім памер безнаяўных жыллёвых субсідый склаў каля 5 рублёў, — дадаў Дзмітрый Казаноўскі.

### Нумар 115 — для ўсёй краіны

Яшчэ адно нованаўвядзенне — адзіная дыспетчарская служба ЖКГ 115, якая пачала сваю работу ў сталіцы, а цяпер функцыянуе ў Віцебску і пачынае работу ў Барысаве, распаўсюдзіцца на ўсе абласныя і раённыя цэнтры краіны, паведаміў **Генадзь АКСЦІЛОВІЧ, начальнік аддзела па рабоце са зваротамі грамадзян і сродкамі масавай інфармацыі Мінжылкамгаса:**

— Гэтая служба — станоўчы вопыт перш за ўсё для спажыўца. Яна забяспечвае адсутнасць неабходнасці шукаць тэлефоны арганізацый, што аказваюць тыя ці іншыя паслугі. Адпаведна, у арганізацый, якія ажыццяўляюць жыллёва-камунальныя паслугі, няма магчымасці здзейсніць маніпуляцыі са скаргамі ці ўтаіць іх, бо кантраляваць выкананне заявак можна ў рэжыме анлайн.

Ён дадаў, што служба 115 стваралася дзеля ўдасканалення работы са зваротамі грамадзян і забеспячэння належнага аказання паслуг насельніцтву. За першае паўгоддзе 2017-га, дарэчы, колькасць зваротаў грамадзян скарацілася на 19%, а палова з іх характарызуецца як кансультацыя ці патрэба ў растлумачэнні. Ускосна гэта таксама паказчык якасці аказаных паслуг.

Памяншэнню колькасці зваротаў, на думку Генадзя Аксціловіча, садзейнічала і ўкараненне з 2014 года прэтэнзіённага парадку разгляду зваротаў. Арганізацыям ЖКГ даецца на работу са зваротам грамадзян па якасці аказаных камунальных паслуг не 15 ці 30 дзён, а адзін дзень. Пры гэтым меры рэагавання павінны прымацца адпаведна тэхнічным нарматыўным актам, што складае, як правіла, ад аднаго да сямі дзён, а ў выпадку аварыі — неадкладна.

Зніжэнне затрат на паслугі ЖКГ — таксама станоўчы момант у рабоце міністэрства, упэўнены Дзмітрый Казаноўскі. За першае паўгоддзе яны знізіліся на 5,7% у параўнанні з мінулагоднімі лічбамі за студзень—чэрвень. Такім чынам удалося зэканоміць 52,15 млн рублёў.

Такое памяншэнне дасягнута за кошт энергазберагальных мерапрыемстваў, зніжэння тэхналагічных страт цеплавой энергіі і вады, расходаў на прыродны газ. Аўтаматызацыя працэсаў і зніжэнне накладных расходаў таксама паспрыяла гэтаму выніку.

Начальнік аддзела эканомікі адзначыў таксама некалькі буйных праектаў сістэмы ЖКГ: будаўніцтва смеццеперапрацоўчага завода і ўдасканаленне сістэмы абыходжання з адходамі ў Гродне, работы па рэканструкцыі ачышчальных збудаванняў у Брэсце, Віцебску, Гродне, будаўніцтва біягазавых комплексаў у Баранавічах і Слоніме.

# Пра смецце і гарачую ваду

Беларусы збіраюць смецце раздзельна лепш за ўсіх у СНД, а тэрміны адключэння гарачай вады ў краіне тэарэтычна можна скараціць, аднак практычна — немэтазгодна, расказалі камунальнікі.

— У Беларусі мяняецца падыход да раздзельнага збору смецця, за што дзякуем грамадзянам. Разам з тым ёсць патэнцыял для яшчэ лепшага выніку, — выказаў меркаванне **Дзмітрый КАЗАНОЎСКІ**. — Яшчэ дзесяцігоддзе назад доля выкарыстаных адходаў у краіне складала 6%, цяпер гэта — 16%, і сярод краін СНД мы лідары. Гэты паказчык лепшы, чым у Латвіі, Славакіі. Беларусь наблізілася па ім да ўзроўню такіх краін, як Партугалія і Іспанія.

Прадстаўнік міністэрства мяркуе, што мясцовым органам улады трэба звярнуць увагу на тэму ўтылізацыі камунальных адходаў там, дзе людзі маральна гатовыя да раздзельнага збору смецця і дзе для гэтага трэба стварыць неабходныя ўмовы.

— Адно з найбольш надзённых пытанняў лета — адключэнне гарачай вады, — закрануў балючую тэму **Генадзь АКСЦІЛОВІЧ**.

Ён расказаў, што скарацiць тэрмін, калі ў кранах гараджан адсутнічае гарачая вада, можна, аднак рабіць гэта немэтазгодна. Пры гэтым ёсць факты, калі стан труб правяраўся за 5 ці 7 дзён.

— Неабходна разумець, што ў межах правядзення прафілактычных захадаў, звязаных з адключэннем гарачай вады ў жылых дамах, выконваецца комплекс мерапрыемстваў для забеспячэння функцыянавання магістраляў і кацельных у асенне-зімовы перыяд для бесперабойнага аказання паслуг насельніцтву. Адпаведна, тэрміны адключэння залежаць ад запланаванага аб'ёму работ, ад выяўленых пашкоджанняў на канкрэтнай сетцы, а таксама ад плана ў рамках правядзення выпрабаванняў.

У тэхналагічнай карце прадугледжаны тэрміны і найменні работ: адключэнне дома, праверка магістральнай трубы пад ціскам, запаўненне сістэмы, паўторны агляд і іншае. Комплекс работ прапісаны, і на яго выкананне неабходна 14 дзён. Ён параўнаў айчынную сітуацыю з прафілактыкай сетак водных камунікацый у Еўропе:

— У еўрапейскіх краінах шырока выкарыстоўваецца будаўніцтва паралельных магістраляў для забеспячэння жылога дома гарачай вадой. На жаль, такія мерапрыемствы вельмі дарагія, і калі браць эканамічны эфект у цэлым, яны сябе не апраўдваюць.

**У Беларусі за студзень — чэрвень 2017-га нарыхтавана 297,7 тысячы другасных сыравіны. Гэта 102% да ўзроўню мінулага года. Адходаў паперы і кардону загатавана 151,8 тысячы тон, шкла — 86 тыс. тон, палімераў — 33,8 тыс. тон, зношаных шын — 19,5 тыс. тон, адпрацаваных масел — 4,5 тыс. тон, адходаў электрычнага і электроннага абсталявання — 2,1 тыс. тон.**

**Ірына СІДАРОК.** *sidarok@zviazda.by*

■ Напярэдадні падзеі

# Ганчароў апрабуе новую праграму

## Мінчане змогуць убачыць скачкі алімпійскага чэмпіёна

**Сталічны Палац спорту 18—19 жніўня прыме этап Кубка свету па скачках на батуце. У спаборніцтвах возьмуць удзел 78 спартсменаў з 16 краін. У Мінску збяруцца практычна ўсе лідары гэтага віду спорту. Традыцыйна моцныя склады прывезлі зборныя Японіі, Украіны, Расіі, Казахстана, Італіі, ЗША і Канады.**



Чэмпіён Алімпійскіх гульняў 2016 года Уладзіслаў Ганчароў на гэтым турніры апрабуе новую праграму скачкоў, з якой пазней плануе выступіць на чэмпіянаце свету. Уладзіслаў адзначыў, што настроены на перамогу, хоць сапернікі ў яго і вельмі моцныя. **Намеснік старшыні тэхнічнага камітэта па скачках на батуце Міжнароднай федэрацыі гімнастыкі Дзмітрый ПАЛЯРУШ** адзначыў, што цяпер беларускія спартсмены перасягаюць у тэхніцы многіх сваіх супернікаў. *«Я кансультую шмат краін, езджу па свеце, дапамагаю, перадаю вопыт. Некаторыя краіны ідуць па нашых слядах»*, — сказаў ён.

Таксама на дамашнім этапе Кубка свету Беларусь прадставяць Алег Рабцаў, Арцём Жук і Мікіта Ільіных (для яго гэта будуць першыя спаборніцтвы ў складзе нацыянальнай зборнай краіны). У жаночай камандзе выступіць Ганна Гарчанок, Марыя Махарынская і Ангеліна Хацян. А вось вопытнай Таццяне Пятрэні трэнеры далі магчымасць аднавіцца і падрыхтавацца да галоўнага старту сезона — чэмпіянату свету ў Балгарыі.

Урачыстая цырымонія адкрыцця адбудзецца 18 жніўня ў 15.30, далей пройдуць кваліфікацыі ў індывідуальных скачках. У суботу з 10 гадзін раніцы пачнуцца кваліфікацыі ў сінхронных скачках, а затым фіналы ў гэтым відзе праграмы, завершыцца турнір фінальнымі індывідуальнымі выступленнямі. Уваход на трыбуны ва ўсе дні турніру вольны.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*

■ Ёсць праблема

# ВЫРАТАВАЦЬ ЯКАСЦЬ РЭАЛЬНА

## Для гэтага неабходна ўвесці сертыфікацыю на абсталяванне па ачыстцы сцёкавых вод

**Такое меркаванне выказаў дырэктар кампаніі «РадалітАква» Дзмітрый СТАНКЕВІЧ на спецыяльнай прэс-канферэнцыі. Толькі так можна перамагчы «гаражную» вытворчасць, якасць прадукцыі якой значна саступае даражэйшым аналагам, упэўнены спецыяліст.**

— На жаль, на сённяшні дзень Беларусь — адзіная краіна сярод дзяржаў-суседзяў, у якой прадукцыя ачышчальных збудаванняў не сертыфікуецца, — адзначыў Дзмітрый Станкевіч. — Гэта прыводзіць да таго, што на тэндарах, якія праводзяцца ў нас у краіне, патэнцыйны пастаўшчык абсталявання можа напісаць абсалютна любую інфармацыю аб сваім прадукце. Але яго словы наогул нічым не пацверджаны! Прывяду прыклад: нямецкае абсталяванне пастаўляецца ў нашу краіну з патрабаваннем ачысткі вады 5 міліграмаў на літр, а ў самой Беларусі патрабаванні — 0,3 міліграма на літр. Не трэба быць экспертам, каб убачыць велізарную розніцу.

З-за адсутнасці сертыфікацыі ўзнікае сур'ёзная праблема. Прадпрыемства, якое добрасумленна хоча ўстанавіць водаачышчальнае абсталяванне, не ведае, купляе яно якасны прадукт ці не. Праверыць і даказаць факт забруджвання вадаёмаў, куды сыходзіць гэтая вада, складана, але трэба ведаць, што сцёкавыя воды прамысловых прадпрыемстваў надзвычай таксічныя. У выніку, замест куплі якаснага абсталявання, прадпрыемства можа заплаціць штраф, які ў маштабах арганізацыі будзе не вельмі вялікім. Аднак значна страшней тое, што прыроды баланс будзе сур'ёзна парушаны.

Самым небяспечным забруджвальнікам з'яўляюцца нафтапрадукты. Цяжкія фракцыі асядаюць на дно вадаёмаў, больш лёгкія складнікі ствараюць нафтавую плёнку на паверхні. З-за гэтага ў вадаём паступае менш кіслароду, — і, як і чалавек у такой сітуацыі, ён пачынае задыхацца. Загінуць могуць не толькі некаторыя насельнікі вадаёма, але і экасістэма ў цэлым.

Што рабіць у такой сітуацыі? На думку Дзмітрыя Станкевіча, ёсць некалькі шляхоў вырашэння праблемы: акрамя сертыфікацыі, адказваць за якасць абсталявання павінен адзін орган або арганізацыя. «Неабходны адзін адказны. Сёння ў нас шэсць адказных за ачышчальныя збудаванні. Гэта вытворца абсталявання і яго пастаўшчык, праекціроўшчык і экспертыза, будаўнічая арганізацыя і непасрэдны заказчык праекта, — паведаміў спецыяліст. — Ва ўсіх свае мэты, але пры гэтым усе спрабуюць пазбавіцца ад магчымай адказнасці. Калі будзе адзін адказны, то няхай ён і займаецца закупкай абсталявання. Прынамсі, ён будзе ведаць, што адпавядае стандартам якасці, а што — не».

— Лічу, што гэтая тэма павінна разглядацца і быць у цэнтры абмеркавання на розных узроўнях, — сказаў **намеснік міністра архітэктуры і будаўніцтва Беларусі Дзмітрый СЕМЯНКЕВІЧ**. — Галоўнае пытанне — не сертыфікацыя, а менавіта якасць абсталявання, наколькі яно адпавядае эканамічнай сітуацыі і патрабаванням па ачыстцы вады. У мяне выклікае пэўныя пытанні тое, наколькі гэтыя патрабаванні сёння эканамічна абгрунтаваныя, паколькі многія з іх сапраўды затратныя. Лічу, што павінны быць падрыхтаваны прапановы, якія не будуць абцяжарваць бізнес, а таксама ствараць бар'еры для вытворчасці няякаснай прадукцыі.

У завяршэнне намеснік міністра паабяцаў разгледзець усе прапановы, якія будуць сфарміраваны. «Мы знойдзем правільнае рашэнне наконт таго, дзе і як гэта ўсё ўлічыць», — дадаў Дзмітрый Семянкевіч.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.** *lukashevich@zviazda.by*

# БЫВАЙ, МАКАРАВІЧ!



З вялікім жалем даведаліся, што пайшоў з жыцця наш калега — Яўген Макаравіч Ляхаў.

Пра яго можна адначасова сказаць — быў сціплы, абаяльны, прынцыповы і вельмі прафесійны чалавек. Маючы за спінай вопыт работы вясковым настаўнікам і ў рэдакцыях «Чырвонай змены», «Во славу Родины» і іншых выданняў, надзвычай плённа працаваў у «штабе» нашай газеты — на выпуску, намеснікам адказнага сакратара. Гэта тая пасада, дзе патрабуецца халодная галава і веданне ўсёй рэдакцыйнай кухні. Такімі якасцямі Яўген Макаравіч валодаў у поўнай меры. Таму ўносіў адчувальны ўклад у забеспячэнне своечасовага выхаду нумароў у свет, высокай якасці іх паліграфічнага і мастацкага афармлення.

А яшчэ знаходзіў час пацешыць чытача (і суразмоўца) рознымі жыццёвымі гісторыямі, якіх ведаў шмат. Быў сапраўдны эрудыт, і вёў у газеце пастаянную рубрыку крыжаванак.

Любіў сваю сям'ю, любіў жыццё і шанаваў калег. Таму з асаблівым імпэтам прыходзіў штодня на працу, у «Звязду», якой аддаў амаль тры дзясяткі гадоў.

Узнагароджаны ордэнам Дружбы народаў, Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР.

Бывай, Макаравіч! Мы ўспамінаем цябе добрым словам.

**Звяздоўцы.**

■ Жніво-2017

# НАСТРОЙ — НА ВЫНІК

**У цэнтральным рэгіёне сёлета плануюць атрымаць каля 2 млн тон збожжа без уліку кукурузы. На 15 жніўня сабрана 1 млн 300 тон зерня.**


Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

— Гэта нядрэнны вынік, — падкрэсліў **старшыня Мінаблвыканкама Анатоль ІСАЧАНКА**, — уборка ідзе ў планавым рэжыме. Калі дазволіць надвор'е, то да канца тыдня плануем у асноўным завяршыць жніво. Застануцца толькі тыя ўчасткі, дзе ўраджай яшчэ не саспеў.

***— Як вы ацэньваеце ўклад хлебаробаў у агульны каравай?***

— Людзі гатовы працаваць і дзень і ноч. Яны кажуць: мы ўбіраем не зерне, а хлеб. Гэта нешта большае. Удзельнікі жніва дастойна зарабляюць. Для іх створаны ўсе ўмовы.

***— На селектарнай нарадзе кіраўнік дзяржавы паставіў задачу дасягнуць ураджайнасці 45 цэнтнераў з гектара. Гэты паказчык павінен стаць дзяржаўным для краіны. Пад сілу ён Мінскай вобласці, Анатоль Міхайлавіч?***

— Мяркую, у перспектыве гэтая задача вырашальная. Трэба выконваць тэхналогію, уносіць угнаенні, наогул, шмат чаго трэба. Сёння ўраджайнасць 38,2 цэнтнера з гектара. Па заканчэнні ўборкі падлічым і скажам, колькі ў нас будзе.

Я аб'ехаў усе рэгіёны. Істотных заўваг няма: паліва ёсць, кадраў дастаткова. Людзі настроены на работу, на вынік. Размаўляў з адным камбайнерам. Ён сам з Мінска, але ўжо пятнаццаты год падчас жніва бярэ на гарадской працы водпуск. Сёлета працуе з сынам, які на МАЗе адвозіць зерне. Жонка жартуе: нават калі б не плацілі, усё роўна працаваў бы: не можа без гэтага жыць.

***— Як будзеце распараджацца сабраным ураджаем?***

— Распараджацца буду не я, а тыя, хто гэты хлеб убраў. Перш за ўсё трэба выканаць дзяржзаказ. Па другое, забяспечыць патрэбы жывёлагадоўлі, тое, што застанецца, пакласці ў засекі, а далей вырашаць: прадаць або выкарыстаць па іншым прызначэнні.

***— Паўднёвыя раёны Міншчыны ўжо закончылі жніво. Ці маюць яны намер прыйсці на выручку суседзям?***

— Бясспрэчна. Каб своечасова і без страт сабраць ураджай, на поўнач вобласці накіравана дадатковая тэхніка з паўднёвых Нясвіжскага, Капыльскага, Клецкага раёнаў. Камбайнеры, кіроўцы будуць працаваць на палях Вілейскага, Крупскага, Барысаўскага раёнаў.

***— Анатоль Міхайлавіч, традыцыйна сельгасарганізацыі дапамагаюць убіраць ураджай збожжавых на прыватных падворках...***

— З сярэдзіны тыдня гаспадаркі пачалі выдзяляць тэхніку там, дзе ёсць у гэтым неабходнасць. Гэта нашы людзі і ім трэба дапамагаць.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
*lazovskaya@zviazda.by*

# ...Уборка ідзе сваім парадкам

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Гаспадарка «Вілія-агра» **Васіля НОВІКАВА**, можна сказаць, справіла дажынкі па збожжавай групе. Тут займаюцца ўсімі відамі збожжавых. Пад іх сёлета было адведзена 200 гектараў. Ураджайнасць склала 36 цэнтнераў з гектара.

А фермерская гаспадарка **Радзіслава ЛЕЎЧУКА** вырошчвае пшаніцу, авёс, трыцікале на 60 гектарах.

— Сёння ці заўтра скончылі б, — гаворыць Радзіслаў Міхайлавіч, — ды здарылася паломка машыны. А для польскага збожжаўборачнага камбайна «Бізон» запчасткі давялося заказваць за мяжой. Таму і адбыўся вымушаны прастой у некалькі дзён. Але патрэбныя дэталі ўжо на пад'ездзе да Кобрына.

Таму завяршыць уборку, паводле слоў гаспадара, будзе справай двух, самае большае трох дзён. А потым тут прыступяць да скошвання кукурузы, на чарзе — бульба. Фермер Ляўчук займаецца яшчэ авечкагадоўляй, таму збожжавыя, кармавыя культуры вырошчвае як на продаж, так і для сябе.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

■ Фестывалім

# ПЕСНІ ПАД ГІТАРУ — РАЗАМ ВЕСЯЛЕЙ!

**Праходжанне паласы перашкод, падрыхтоўка страў і інтэлектуальныя спаборніцтвы. Гэта і не толькі адчула на сабе моладзь Міншчыны. Маладзёжны фестываль актыву Мінскай абласной арганізацыі БРСМ «ВасількоВы вянок — 2017» праходзіў цягам трох дзён у Любанскім раёне.**





Удзельнікамі мерапрыемства сталі прадстаўнікі прадпрыемстваў, арганізацый, устаноў Мінскай вобласці. Каманды паспаборнічалі ў спартыўных конкурсах: пляжны валейбол і футбол, праходжанне паласы перашкод. У праграме — спаборніцтвы па рыбнай лоўлі і гатаванні страў. Праявіць кемлівасць і крэатыўнасць удзельнікі фестывалю змаглі ў конкурсах візітовак і абароны лагера. Усяго ў злёце прынялі ўдзел трынаццаць каманд Мінскай вобласці. Па выніках фестывалю першае месца раздзялілі дзве каманды — з Клецкага і Мінскага раёнаў. Менавіта яны змаглі найбольш ярка праявіць сябе ў творчасці, спорце, прадэманстраваўшы самы моцны і дружны «Васільковы вянок».

**Марына БЕГУНКОВА. Фота аўтара.**
*Любанскі раён*

# ДЗЕ ЛЕТА, ТАМ ІНФЕКЦЫІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— На жаль, яшчэ застаецца, хоць і невялікая, колькасць тых, хто ігнаруе вакцынацыю, — кажа **намеснік галоўнага ўрача Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя, кандыдат медыцынскіх навук Ірына ГЛІНСКАЯ**. — У цэлым размова ідзе пра 97 працэнтаў прышчэпленых дзяцей, а па некаторых інфекцыях гэта нават 98—99. Не ва ўсіх астатніх выпадках размова ідзе пра адмаўленне — бывае, прышчэпкі проціпаказаны...

Характэрная для цёплай пары года ВОСТРАЯ КІШЭЧНАЯ ІНФЕКЦЫЯ застаецца таксама на ўзроўні мінулага года (сальманелёзу нават крыху менш). Яшчэ гадоў дзесяць таму нам пагражалі, галоўным чынам, бактэрыяльныя кішэчныя інфекцыі (тыя ж дызентэрыя, сальманелёз), аднак сёння больш за палову гэтых інфекцый маюць вірусную паходжанне. Перадаюцца яны вельмі лёгка, прычым не толькі харчовым ці водным шляхам, як бактэрыяльныя, але і кантактна-бытавым. Узбуджальнік досыць працяглa выдзяляецца ў наваколле, а таму чалавек, які перанёс захворванне ў лёгкай форме і добра сябе адчувае, пры некаторых інфекцыях ажно да 50 дзён можа перадаваць вірус навакольным. Каб гэтага не адбылося, усе мы пастаянна павінны прытрымлівацца элементарных гігіенічных правілаў.

Лячэнне кішэчных інфекцый мае на ўвазе дэтаксікацыю і барацьбу з абязводжваннем. Так што самае важнае — паболей піць чыстай вады. Калі ж гэта дзіця, якое ванітуе, трэба выклікаць «хуткую» і шпіталізаваць, каб уводзіць вадкасць з дапамогай кропельніцы. Неабходна таксама прымаць актываваны вугаль, смекту або іншыя сродкі гэтага шэрагу. Калі ёсць тэмпература (звыш 38 градусаў), патрабуюцца гарачкапаніжальныя сродкі. Неабходна трымацца дыеты — не ўжываць вострае, мясное, малочнае.

ЭНТЭРАВІРУСНЫХ ІНФЕКЦЫЙ (іх, дарэчы, больш за 70) стала на 36 працэнтаў менш, чым летась. Рэгіструюцца лёгкія формы. Спецыфічнай вакцыны ад такіх інфекцый не існуе, а таму галоўнай зброяй таксама застаецца асабістая і грамадская гігіена. Энтэравірусы могуць пашкоджваць любыя органы (кішэчнік, цэнтральную нервовую сістэму, галаўны мозг, дыхальныя шляхі, скуру і г. д.), а перадаюцца элементарна — бытавым, паветрана-кропельным, харчовым і водным шляхамі. Вірусаносьбіт можа нават не мець нейкіх сімптомаў, аднак здольны заразіць іншых. Могуць быць успышкі і нават эпідэміі, асабліва ў краінах з нізкім узроўнем жыцця. У большасці выпадкаў пакутуюць дзеці — у першую чаргу ад гастраэнтэрыту, герп-ангіны, менінгіту... Для таго, каб абараніцца, неабходна правільна харчавацца, піць чыстую ваду, добра мыць рукі. Гэтак жа паводзіць сябе і ў іншых краінах. Што да паведамленняў пра масавыя выпадкі энтэравірусных захворванняў у Турцыі, то паводле афіцыйных паведамленняў, ні пра якую эпідэмію размова не ідзе, зафіксаваны ўсяго адзін выпадак з жыхаром Украіны, чыё захворванне лабараторна нават не пацверджана.

**Вірусаносьбіт можа нават не мець нейкіх сімптомаў, аднак здольны заразіць іншых. Могуць быць успышкі і нават эпідэміі, асабліва ў краінах з нізкім узроўнем жыцця.**

Што да КЛЕШЧАВЫХ ІНФЕКЦЫЙ — як у дзікай прыродзе, так і на гарадскіх тэрыторыях — распаўсюджаны яны сёлета менш, чым летась. Колькасць людзей, якія звярнуліся ў органы аховы здароўя з укусамі, таксама ніжэйшая — 24 тысячы, а было летась звыш 32 тысяч. На 17 працэнтаў знізілася ва ўсіх рэгіёнах і колькасць выпадкаў барэліёзу.

— Даследаваць кляшча сёння не абавязкова, дастаткова звярнуцца да ўрача, каб атрымаць антыбактэрыяльную прафілактыку, — тлумачыць Ірына Мікалаеўна. — І праходзіць яе неабходна пасля кожнага ўкусу. Вядома, што барэліямі інфіцыравана каля 30 працэнтаў кляшчоў, аднак яны могуць змяшчаць іншыя бактэрыяльныя ўзбуджальнікі, супраць якіх таксама скіравана антыбактэрыяльная прафілактыка, у той час як даследаванне праводзіцца толькі на барэліёз. Пакуль клешч будзе абследаваны, пройдуць каштоўныя для пачатку тэрапіі трое сутак. Дарэчы, людзі, якія захварэлі на барэліёз, не звярнуліся пасля ўкусу да ўрача і не правялі такую тэрапію...

Вакцынацыю супраць клешчавага энцэфаліту не прапануюць кожнаму, хто ідзе ў лес. Яе атрымліваюць тыя, хто дзякуючы сваёй прафесіі праводзіць доўгі час у тых жа лясных масівах. Аднак калі вы сабраліся на адпачынак на Далёкі Усход, Урал, то зрабіць такую прышчэпку мэтазгодна — варта толькі паклапаціцца аб гэтым своечасова (выконваецца дзве прышчэпкі, і абарона развіваецца толькі праз 21 дзень пасля апошняй).

Нягледзячы на тое, што геаграфія паездак пастаянна пашыраецца, ЭКЗАТЫЧНЫЯ ІНФЕКЦЫІ на тэрыторыі Беларусі не зафіксаваны. Выключэнне — адзінкавыя выпадкі малярыі (прывезеныя з Індыі, Конга, Судана). У розных краінах выяўляюцца розныя ўзбуджальнікі, а пацікавіцца гэтым можна на сайтах Міністэрства аховы здароўя і Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя. Праяўляць цікаўнасць неабходна не за дзень да ад'езду, а мінімум за месяц.

**Святлана БАРЫСЕНКА.** *protas@zviazda.by*

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

17 ЖНІЎНЯ 2017 г.
ЧАЦВЕР
№15 (15822)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

*Імёны*

# Дзмітрый ЛІТВІНОВІЧ: «CherryVata «абнулілася» і пачала новае жыццё»



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**Калі ўвесну з'явіліся навіны пра тое, што CherryVata прадставілі новы альбом Daybreak, многія меламаны здзівіліся. Маўляў, занадта доўга ад гурта не было ніякіх навін, занадта шмат часу каманда не выступала з канцэртамі і не прадстаўляла новых рэлізаў. Але ж насуперак скептыкам электроншчыкі CherryVata абнавілі склад і гучанне, даказалі сваю жыццяздольнасць, нават больш — падкрэслілі актуальнасць сваёй музыкі, скіраваўшы творчыя намаганні ў бок electronic pop стылістыкі. Пра тое, наколькі цяжка пачынаць прамаўляць уголас пасля доўгага маўчання, ці змяніліся ўмовы гульні на музычным рынку і ці прынялі хіпстары памкненні эксперыментатараў старога пакалення — наша гутарка з лідарам CherryVata Дзмітрыем ЛІТВІНОВІЧАМ.**

***— Папярэдні ваш альбом выйшаў досыць даўно, каля васьмі гадоў таму. Многія нават думалі, што гурта ўжо не існуе. Чаму праца над новым рэлізам так зацягнулася?***

— Сапраўды, папярэдні альбом пабачыў свет у 2009 годзе, тады гурт жыў вельмі актыўным творчым жыццём. У нас быў вялікі склад, многа гастроляў, прапаноў, фестываляў. Але праз некаторы час мы пачалі разыходзіцца ў поглядах: некаторыя ўдзельнікі пасталелі, нехта змяніў жыццёвыя прыярытэты, нехта пачаў працаваць над уласнымі праектамі. У мяне з'явілася сям'я і не было магчымасці ды і часу збіраць новы склад. Але пры гэтым музыкай я працягваў займацца, распачаў сольны праект, ды і як CherryVata зборным складам мы эпізадычна выступалі.

***(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)***

*Адпачыць і зарабіць*

# УДЗЕНЬ — БУДОЎЛЯ, УВЕЧАРЫ — МУЗЕЙ

Як байцы з трох краін узводзяць новую спартыўную арэну

**Сярод усіх маладзёжных будоўляў гэтага лета мінская гарадская — асаблівая. Па-першае, атрад, які тут працуе, — міжнародны, у яго склад уваходзяць хлопцы з трох краін: Беларусі, Расіі і Украіны. А, па-другое, усе яны з'яўляюцца актывістамі маладзёжных арганізацый. Карэспандэнты «Чырвонкі. Чырвонай змены» пабывалі на ўзвядзенні Цэнтра алімпійскай падрыхтоўкі па мастацкай гімнастыцы і даведаліся, што прывяло расіян і ўкраінцаў у Беларусь.**

— Я яшчэ вучуся — на псіхолага, — расказвае **камандзір будатрада «Украіна — Расія — Беларусь» імя 100-годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі Дзяніс ЧУБАХА.** — Скончыў чацвёрты курс Краматорскага эканоміка-гуманітарнага інстытута. Падпрацоўваю ў сферы рэкламы, трохі займаюся журналістыкай (рэдагую сайт з навінамі свайго роднага горада), а таксама з'яўляюся першым сакратаром камсамольскай арганізацыі Данецкай вобласці. Родам з Данбаса, з Канстанцінаўкі. У Беларусь на будоўлю прыязджаю ўжо трэці год запар, летась таксама быў камандзірам атрада, што працаваў на рэканструкцыі стадыёна «Дынама». Нас запрасілі Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі і Ліга камуністычнай моладзі.

***(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)***



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**Штодзённая праца пад адкрытым небам байцоў не палохае.**

*Клуб «Залатыя рукі»*

# ПРАФЕСІЙНЫ АЛІМП ЧАКАЕ НОВЫХ ГЕРОЯЎ

## Руху WorldSkills Belarus патрабуецца ўласны брэнд

**У кастрычніку ў Абу-Дабі (ААЭ) пройдзе 44-ы чэмпіянат WorldSkills International, у якім возьмуць удзел і беларусы. Для нашых хлопцаў і дзяўчат гэта будзе ўжо другая спроба выступлення на самым высокім міжнародным узроўні. Пра тое, што сёння ўяўляе сабой рух WorldSkills, чаму да гэтых спаборніцтваў прыцягнута такая пільная ўвага з боку дзяржавы і бізнесу, і з якім настроем адпраўляюцца ў Аб'яднаныя Арабскія Эміраты нашы канкурсанты, нам расказаў рэктар Рэспубліканскага інстытута прафесійнай адукацыі, кандыдат педагагічных навук, дацэнт Валерый ГАЛУБОЎСКІ.**



Фота Канстанціна ДРОБАВА.

### ПАСПЯХОВЫ СТАРТ

— На сённяшні дзень асацыяцыя WorldSkills International аб'ядноўвае 77 краін-удзельніц, у якіх пражывае больш за 70 працэнтаў насельніцтва зямнога шара. Галоўная мэта WSI — папулярызацыя рабочых прафесій у сучасным грамадстве, у тым ліку праз правядзенне міжнародных спаборніцтваў, якія яшчэ называюць алімпіядай у прафесійным майстэрстве. Кожныя два гады WorldSkills праводзіць конкурс у шасці сферах: транспарт і лагістыка, будаўніцтва і тэхналогія будаўнічай вытворчасці, тэхналогія вытворчасці і тэхналогія машынабудавання, інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі, творчыя прафесіі і сацыяльна-бытавое абслугоўванне. Але спаборніцтвы праводзяцца не дзеля саміх спаборніцтваў. Іх фармат выкарыстоўваецца для таго, каб павысіць прэстыж рабочых прафесій сярод моладзі і спрыяць распаўсюджванню ў свеце міжнародных прафесійных стандартаў. Беларусь далучылася да WorldSkills International (WSI) у студзені 2014 года. А ўжо ў маі ў нас прайшоў Першы нацыянальны чэмпіянат прафесійнага майстэрства «WorldSkills Беларусь — 2014» па правілах і з выкарыстаннем зместу заданняў WSI. Яго ўдзельнікамі сталі больш як 150 канкурсантаў — прадстаўнікі ўстаноў прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай адукацыі і работнікаў прадпрыемстваў ва ўзросце да 21 года, якія спаборнічалі ў 20 кампетэнцыях.

***(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)***



# ПРАФЕСІЙНЫ АЛІМП ЧАКАЕ НОВЫХ ГЕРОЯЎ

Першае сур'ёзнае «баявое хрышчэнне» нашы хлопцы і дзяўчаты атрымалі ў маі 2015 года ў Казані, на чэмпіянаце WorldSkills для краін СНД, дзе яны заваявалі адну залатую ўзнагароду і 16 сярэбраных медалёў. А ў жніўні наша моладзь прадстаўляла нацыянальную сістэму прафесійнай адукацыі на сусветным чэмпіянаце ў Бразіліі, дзе за перамогу змагаліся 1200 удзельнікаў з 63 краін.

Беларуская зборная ў складзе 17 чалавек спаборнічала ў 15 кампетэнцыях. Пры падвядзенні вынікаў прэзідэнт арганізацыі WorldSkills International Сайман Бартлі заявіў, што ў гісторыі руху WorldSkills не было выпадку, каб краіна, якая толькі што далучылася да спаборніцтваў, адразу здзейсніла магутны рывок і трапіла ў «топ» пераможцаў. Так, на п'едэстал мы хоць і не «ўскочылі», але, па меркаванні арганізатараў, гэта быў самы паспяховы старт краіны, якая толькі далучылася да руху WorldSkills за ўсе гады правядзення спаборніцтваў: мы апынуліся ў цвёрдай сярэдзіне ва ўсіх кампетэнцыях. Больш за тое, заваявалі два медалі. Іх называюць «медалямі выдатніка». Але на англійскай мове назва ўзнагароды гучыць як Medal of Excellence — медаль дасканаласці або перавагі (іх выдавалі ўдзельнікам чэмпіянату, якія набралі 500 і больш балаў, але не былі ўзнагароджаны залатым, сярэбраным ці бронзавым медалём).

## СТАНДАРТЫ ЗАЎТРАШНЯГА ДНЯ

***— Калі мы далучаліся да руху WorldSkills, казалі што для нас гэта выдатная магчымасць зверыць гадзіннікі ў сістэме прафесійнай адукацыі. І што паказаў гадзіннік? Ці канкурэнтаздольныя нашы спецыялісты?***

— Вяртаючыся да Бразіліі, хачу адзначыць, што навучэнка Мінскага прафесійна-тэхнічнага каледжа швейнай вытворчасці Вольга Закрэўская, якая выступала ў кампетэнцыі «Дызайн адзення», перамагла ў спаборніцтвах дызайнераў найлепшых еўрапейскіх школ. А кандытар Марыя Кушвід стала другой у Еўропе, яна апярэдзіла па балах італьянцаў і аўстрыйцаў — прызнаных ва ўсім свеце кандытараў, саступіўшы толькі французам, якія ў выніку занялі другое месца ў свеце (у Марыі было шостае месца).

Увогуле, **прафесійныя стандарты WorldSkills — гэта стандарты заўтрашняга дня**. Для прыкладу, муляр, якога рыхтуюць у нашых прафесійна-тэхнічных установах, выконвае тры-чатыры віды работ, а па патрабаваннях WorldSkills кампетэнцыі муляра больш шырокія — гэтыя спецыялісты павінны выконваць таксама арачныя і пячныя работы. Цырульнік павінен быць універсальным майстрам: рабіць і жаночыя, і мужчынскія, і дзіцячыя стрыжкі. Зваршчык — ведаць чатыры віды зваркі, а не адну-дзве. А кандытар — працаваць з шакаладам, рабіць з яго цукеркі ручной работы

**Сусветнае першынство — гэта своеасаблівы выклік для нацыянальнай сістэмы прафесійнай адукацыі**, паколькі патэнцыяльныя інвестары ацэньваюць перш-наперш нашу краіну. Для таго, каб выпускаць канкурэнтаздольную на знешніх рынках прадукцыю, патрабуецца не толькі сучасныя тэхналогіі, але і спецыялісты самай высо-

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)***



кай кваліфікацыі, якія змогуць працаваць па сучасным абсталяванні.

А каб зразумець, наколькі кампетэнцыі, якімі валодаюць навучэнцы і выпускнікі нашых устаноў адукацыі, адпавядаюць сусветным стандартам падрыхтоўкі спецыялістаў, мы павінны выкарыстоўваць міжнародныя індыкатары якасці.

**WorldSkills — проста ідэальная пляцоўка для абмену ведамі, вопытам і найлепшымі практыкамі ўдасканалення сістэмы падрыхтоўкі кадраў.** Мы атрымалі доступ да самых сучасных кваліфікацый і бачым, куды нам варта рухацца, каб нашы навучэнцы, маладыя рабочыя адпавядалі выклікам сучаснасці. Патрабуецца больш гнуткая, больш прадуманая сувязь з працадаўцамі, якія павінны быць не толькі спажыўцамі кадраў, але саўдзельнікамі адукацыйнага працэсу. **Абвінавачанні ў тым, што сістэма адукацыі не паспявае за рынкам працы, што яна кансерватыўная, несправядлівыя.** Проста ў нас не заўсёды ёсць доступ да інфармацыі пра тое, што адбываецца ў рэальным сектары эканомікі, якая новая тэхналогія з'явілася. Таму **працадаўцы павінны быць у звязцы з тымі, хто рыхтуе для іх кадры**, удзельнічаць у фарміраванні матэрыяльна-тэхнічнай базы і фінансаванні ўстаноў адукацыі.

Сёння ўсе, у тым ліку і высокаразвітыя краіны свету, шукаюць адказы на адны і тыя ж пытанні. Пры сучасным імклівым развіцці тэхналогій па якіх прафесіях трэба вучыць і як гэта рабіць? На думку многіх спецыялістаў, **дзеці, якія сёння ідуць у школу, будуць працаваць па прафесіях, якіх пакуль яшчэ не існуе**. Апошнім часам сямімільнымі крокамі развіваюцца тэхналогія дапоўненай віртуальнай рэчаіснасці, інтэрнэт рэчаў. Прывяду адзін факт, які, напэўна, мала хто ведае. Беларускі «БелАЗ» укараніў тэхналогію, якая дазваляе з Жодзіна кантраляваць самазвалы, што бегаюць па ўсім свеце. Напрыклад, можна ў любы момант даведацца пра ціск у шынах «БелАЗа», што працуе ў кар'еры на афрыканскім кантыненце. Для чаго гэта зроблена? Каб убачыць, як эксплуатуецца аўтамабіль і своечасова забяспечыць яго абслугоўванне. Гэта сэрвіс найвышэйшага ўзроўню, калі вытворца дакладна ведае, што адбываецца з кожнай адзінкай выробленай ім прадукцыі і можа аператыўна на гэта адрэагаваць.

Сёння ўжо з'яўляюцца беспілотныя аўтамабілі. З'явілася таксі UBER. Раней сядзелі аператары і прымалі заказы, а цяпер пасрэднік знік: ёсць спажывец і ёсць выканаўца. Наступны крок — знікнуць і кіроўцы. Але ўзнікае цалкам заканамернае пытанне: а чым жа будуць займацца людзі? Кадры павінны сыходзіць у сферу праектавання і праграмавання. Хтосьці павінен выраблядь тыя ж беспілотныя транспартныя сродкі, забяспечваць іх тэхнічнае абслугоўванне, суправаджэнне, таму кваліфікацыя рабочых павінна быць намнога вышэйшая, чым сёння.

## УКЛАСЦІСЯ Ў ШЭСЦЬ ГАДЗІН

***— А чаму спаборніцтвы WorldSkills International называюць чэмпіянатам рабочых прафесій, хоць у іх удзельнічаюць і прадстаўнікі вышэйшай школы?***

— Трэба адыходзіць ад стэрэатыпа, што сучасны рабочы — той, хто проста круціць гайкі. Гэта эрудзіраваны, высокакваліфікаваны спецыяліст, які, акрамя прафесійных ведаў, павінен валодаць спецыфічнымі навыкамі ў сумежных галінах, у тым ліку разбірацца ў інфармацыйных тэхналогіях, робататэхніцы і г.д. Нам увогуле трэба адыходзіць ад паняццяў «рабочы», «тэхнік» і «інжынер». Мяжа паміж рабочым і інжынерам усё больш размываецца. Для таго, каб працаваць на сучаснай тэхналагічнай лініі, ужо недастаткова наяўнасці нават сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Заказчыкі кадраў настойваюць на тым, што ў сувязі з шырокамаштабнай мадэрнізацыяй у прамысловасці ім патрабуюцца спецыялісты, якія валодаюць адначасова некалькімі кампетэнцыямі, могуць не толькі выконваць пэўныя аперацыі на абсталяванні, але і абслугоўваць яго. Сёння токар, які працуе на сучасным станку з лічбавым праграмным кіраваннем, у адной асобе і тэхнолаг, і наладчык, і аператар, які кантралюе прыладу. А мехатронік — спецыяліст-дыягностык, які можа вызначыць няспраўнасць механізма і правесці дробны рамонт: ён ведае і механіку, і пнеўматыку, і электроніку...

На міжнародных спаборніцтвах у кампетэнцыях «Фрэзерныя работы» і «Такарныя работы» канкурсанты атрымліваюць дастаткова складаны чарцёж дэталі: ад іх патрабуецца стварыць 3D-мадэль, распрацаваць тэхналагічны маршрут вырабу дэталі, напісаць праграму, потым падабраць і зманціраваць інструмент на станку і вырабіць дэталь. Раней гэта выконвалі тры спецыялісты: тэхнолаг пісаў праграму і тэхналагічны маршрут, наладчык займаўся наладкай, а аператар выконваў работу непасрэдна на станку. І патрабавалася для гэтага 5—7 дзён. А на чэмпіянаце свету даецца ўсяго 6 гадзін. Лічыцца, што кваліфікаваны спецыяліст павінен за гэты час справіцца з пастаўленай задачай.

На сусветным першынстве прадстаўлены і такія кампетэнцыі, як «Мабільная робататэхніка», «Тэхнічнае праектаванне CAD», «Праграмнае забеспячэнне для бізнесу», «Электроніка», «Кабельныя інфармацыйныя сеткі» — у нас гэта ўзровень вышэйшай адукацыі.

У сусветнага руху WorldSkills ёсць дэвіз «Удасканальвай свет прафесійнымі навыкамі». У Расіі нацыянальны чэмпіянат WorldSkills называецца «Маладыя прафесіяналы». Нам таксама трэба падумаць над уласным брэндам. Патрабуецца цэнтральная ідэя, якая адлюстроўвала б усю спецыфіку і важнасць для нас гэтага руху. **Паняцце «рабочая прафесія», як і стаўленне да яе прадстаўнікоў трэба «перазагрузіць».** Будзем удзячныя ўсім за крэатыўныя ідэі!

## НАШЫ ШАНЦЫ

***— Відавочна, што падрыхтоўка каманды для ўдзелу ў спаборніцтвах у Абу-Дабі — справа не менш сур'ёзная, чым падрыхтоўка алімпійцаў...***

— У Аб'яднаных Арабскіх Эміратах будуць прадстаўлены 68 краін, удзельнікі з якіх выступяць па 52 кампетэнцыях. Плануецца, што беларусы будуць прадстаўлены ў 27. Да тых кампетэнцый, у якіх мы выступалі ў Бразіліі, дадаліся такія, як «Абліцовачныя работы», «Выраб мэблі», «Зварачныя работы», «Сухое будаўніцтва», «Вэб-дызайн» і іншыя. Але заўважу, што колькасць кампетэнцый, у якіх будзе выступаць тая ці іншая краіна, не залежыць ні ад яе памераў, ні ад колькасці насельніцтва. Адзіны крытэрый — гэта прыярытэтнасць развіцця тых ці іншых сектараў эканомікі. Мы выбіраем тое, што важна, у першую чаргу, для развіцця і пашырэння экспартных магчымасцяў беларускай эканомікі.

Над падрыхтоўкай удзельнікаў зборнай да сусветнага чэмпіянату працуюць сёння лепшыя педагогі і эксперты краіны пад кіраўніцтвам Міністэрства адукацыі і нацыянальнага аператара WSI — Рэспубліканскага інстытута прафесійнай адукацыі. Прыцягваюцца і міжнародныя эксперты.

Мы не ўпусцілі магчымасць і паўдзельнічалі сёлета ў двух буйных міжнародных чэмпіянатах. У Краснадары ў рамках V нацыянальнага чэмпіянату «Маладыя прафесіяналы — 2017» (WorldSkills Russia) адбыўся чэмпіянат краін — членаў Еўразійскай прасторы. Там **нацыянальная зборная Беларусі заваявала 2 залатыя медалі, 21 сярэбраны і 6 бронзавых медалёў**. Лепшым у кампетэнцыі «Вытворчасць мэблі» стаў другакурснік Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта Іван Скорб. А ў кампетэнцыі «Тэхналогія моды» — навучэнка Гродзенскага каледжа тэхнікі, тэхналогій і дызайну Вольга Кушнер.

А ў чэрвені 18 нашых хлопцаў і дзяўчат прынялі ўдзел у міжнародным чэмпіянаце China International Skills Competition 2017 (CISC), які прайшоў у двух кітайскіх гарадах — Шанхаі і Сучжоу з удзелам прадстаўнікоў з 35 краін. Такі далёкі шлях на ўсход пераадолелі ўдзельнікі нашай зборнай, каб прадэманстраваць сваё прафесійнае майстэрства ў 15 кампетэнцыях. Заўважу, што Кітай далучыўся да міжнароднага руху WorldSkills International у 2010 годзе і прэтэндуе на правядзенне 46-га чэмпіянату свету WorldSkills Competition у 2021 годзе разам са Швейцарыяй.

Заданні на спаборніцтвах былі набліжаны да міжнародных, але на выкананне іх было дадзена менш часу. Дарэчы, усе беларускія ўдзельнікі выступілі ў Кітаі даволі ўдала. Нацыянальная зборная заваявала «серабро», «бронзу» і два медалі Medallion of Excellence. Сярэбраным прызёрам у кампетэнцыі «Цырульніцкае мастацтва» стала Надзея Кашцялян, навучэнка Брэсцкага дзяржаўнага каледжа сферы абслугоўвання. Студэнты Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта Аляксандр Мацвяйчук і Андрэй Часлоў занялі трэцяе месца ў кампетэнцыі «Мабільная робататэхніка». Уявіце сабе, у нас гэта кампетэнцыя яшчэ не толькі не ўкараняецца, а ўвогуле толькі пачынае агучвацца, і гэта той выпадак, калі сістэма прафесійнай адукацыі апярэджвае заказ у адпаведных спецыялістах. А ў кампетэнцыі «Мехатроніка» мы хоць і не занялі прызавое месца, але пакінулі ззаду ўсе еўрапейскія краіны, у тым ліку і Германію, якая ўвяла гэту спецыяльнасць яшчэ першай яшчэ больш як дзесяць гадоў таму.

Па выніках удзелу нашых канкурсантаў у спаборніцтвах у Расіі і Кітаі быў скарэкціраваны склад нашай нацыянальнай зборнай у Абу-Дабі. Мушу канстатаваць, што не заўсёды пераможца нацыянальнага першынства аўтаматычна трапляе на міжнародны ўзровень. Чэмпіянат свету і нацыянальны чэмпіянат раздзяляе адрэзак працягласцю больш як год. І за гэты час хтосьці эмацыянальна выгарае, сыходзіць з дыстанцыі, а мы можам убачыць, што з'явілася новая «зорачка», якая валодае шанцамі на перамогу. Таму да спаборніцтваў рыхтуюцца паралельна заўсёды некалькі чалавек.

Яшчэ адзін **абавязковы пункт падрыхтоўкі — свабоднае валоданне англійскай мовай, прычым прафесійнай лексікай, каб выключыць пасрэдніка-перакладчыка на конкурснай пляцоўцы**. Для нас гэта быў моцны сігнал: трэба пераглядаць падыходы да вывучэння замежнай мовы, каб яно мела больш прыкладны характар. Усіх удзельнікаў нашай зборнай мэтанакіравана рыхтуюць выпускнікі Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта, якія за прайшоўшы пасля чэмпіянату ў Бразіліі час таксама вельмі моцна прасунуліся ў засваенні тэхнічнай тэрміналогіі.

***— А як складваецца прафесійная кар'ера ва ўдзельнікаў папярэдняга чэмпіянату свету?***

— Адразу пасля спаборніцтваў некалькі прадпрыемстваў сталі ў чаргу за нашымі станочнікамі. Вольга Закрэўская, якую я згадвала вышэй, засталася працаваць майстрам у сваёй навучальнай установе. Фактычна яна перайшла на трэнерскую работу, і цяпер яе досвед вельмі запатрабаваны ў падрыхтоўцы нашых новых канкурсантаў. А Мікіта Цвяткоў, якому ў Бразіліі крышачку не пашанцавала з «заморскай» бульбай, стаў шэф-поварам рэстарана ў Магілёве, і, наколькі я ведаю, месца ў гэтай установе трэба браніраваць загадзя.

Хачу дадаць, што ў чэрвені ў Савеце Міністраў нашай краіны адбылася сустрэча прэм'ер-міністра Андрэя Кабякова з прадстаўнікамі сістэмы адукацыі, на якой абмяркоўваліся далейшыя шляхі развіцця ў Беларусі руху WorldSkills. І там было дарučана разгледзець магчымасць прадастаўлення пераможцам спаборніцтваў WorldSkills ільгот пры ўмове іх паступлення на больш высокі ўзровень навучання, такіх, якія прадастаўляюцца, напрыклад, пераможцам алімпіяд па вучэбных дысцыплінах ці пераможцам спартыўных спаборніцтваў. Упэўнены, што гэта было б справядлівым.

**Гутарку вяла**
**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

Яны руляць!

# «ТЫСЯЧНІКІ» Ў ПОЛІ,

## ці Як шчыруюць на жніве маладзёжныя экіпажы

**Гэтым летам на палях краіны працуе больш за тысячу маладзёжных экіпажаў камбайнераў. Самы вялікі паказчык — на Міншчыне, тут гэтая лічба дасягае 216. У гаспадарцы «Праўда-Агра», філіяле ААТ «Агракамбінат «Дзяржынскі», што на Дзяржыншчыне, першым камбайнерам, які намалаціў тысячу тон збожжа, стаў 27-гадовы трактарыст-машыніст Віталь КУНІЦКІ. Карэспандэнты «Чырвонкі. Чырвонай змены» завіталі на працоўнае месца перадавіка і даведаліся, што натхняе маладых камбайнераў на рэкорды.**

— Я мясцовы, родам з аграгарадка Томкавічы, — расказвае Віталь. — У сельскую гаспадарку прыйшоў пасля службы ў войску. У дзяцінстве падпрацоўваў памочнікам на бацькавым камбайне, таму пасля вяртання з арміі над будучай прафесіяй доўга не раздумваў. Тата цяпер ужо не працуе на жніве — раздае кармы на малочнатаварным комплексе. А дынастыю працягваю я. Ці цяжкая праца? Ведаеце, на вёсцы іншай няма. Але мы прывучаны з дзяцінства, што калі хочаш добра жыць, — трэба працаваць. Уборачная, вядома, вельмі адказны перыяд, хоць я б не стаў недаацэньваць астатнія. Тое, што мы цяжка працуем летам, далёка не значыць, што ў астатні час прахалоджваемся. Адрозненне толькі ў тым, што тут адразу бачыш вынік сваёй працы.

Сярод іншых хлопца вылучае і тое, што ён працуе без памочніка. Маладому чалавеку даверылі нямецкі камбайн Claas Lexion 560 — на ім зручна ўбіраць збожжа і аднаму.

— Нас адразу прывучалі працаваць самастойна, — тлумачыць Віталь. — Такі падыход у агракамбіната. Адзінае, што трэба трохі болей увагі машыне ўдзяляць, — за ўсім сочыш сам. Намалаціў ужо трохі болей за тысячу, а хацелася б пабіць уласны рэкорд — 3 600 тон. Паставіў яго ў 2014 годзе.

Адзначым, што Віталь — неаднаразовы лідар жніва. Ужо на працягу пяці гадоў запар ён адным з першых у раёне пераадольвае рубеж у тысячу тон намалоту. У свой час малады камбайнер быў прызёрам рэспубліканскіх «Дажынак», перамагаў на раённым фестывалі-кірмашы.

— Пра змену прафесіі ніколі не задумваўся, — прызнаецца рэкардсмен. — Нашы бацькі працавалі на зямлі, мы працягваем іх справу. Тым больш, падчас уборачнай можна няблага зарабіць. Летась, напрыклад, за ўвесь час жніва атрымаў каля 2 500 рублёў. Грошы ў асноўным ідуць на дзяцей: маю дачку — яна ўжо пайшла ў дзіцячы садок — і сына, яму яшчэ толькі споўніцца годзік. Стараемся з жонкай, каб у хаце ўсё было. Конкурс маладых камбайнераў, безумоўна, стымулюе, але я думаю, што нават калі б яго не было, мы працавалі б не горш.



Разам у бітве за ўраджай і ў сямейных клопатах — муж і жонка Іван і Вольга Шацілы нават пазнаёміліся ў полі.

На момант нашага візіту зусім трохі не хапала да тысячы тон і экіпажу, у складзе якога працуюць муж з жонкай. 29-гадовы **трактарыст-машыніст Іван ШАЦІЛА** родам з вёскі Баравікі, пазнаёміўся са сваёй старэйшай на год сужэнкай Вольгай у полі, калі тая прыехала на Дзяржыншчыну працаваць па размеркаванні аграномам-хімікам. Малады чалавек якраз падвозіў хімікаты на палеткі, так і завязалася знаёмства. Яны разам ужо дзевяць гадоў.

— Трактарыстам працаваў мой бацька, — кажа камбайнер. — У дзяцінстве разам з ім даглядаў машыну, нечаму вучыўся. Потым паступіў у абласны аграрна-тэхнічны прафесійны ліцэй, што ў Дзяржынску, пазней завочна скончыў Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт. Працую з 19 гадоў. Жонка вырашыла пашчыраваць разам са мной толькі сёлета — у яе ўжо праз месяц заканчваецца дэкрэтны адпачынак, і пакуль дзіця ходзіць у садок, мы зарабляем на жыццё. На гэты момант я ёй задаволены, усе загады выконвае добра *(смяецца)*. Раней працавалі з мясцовым хлопцам, але ён знайшоў сабе іншую работу.

Іван таксама сцвярджае, што яго справа — не з лёгкіх. Але камбайнеру цікавы сам працэс. Уборку ён параўноўвае з хаджэннем на караблі па моры — часам з аднаго канца поля іншага нават і не ўбачыш. Асабісты рэкорд «капітана» — дзве тысячы тон. Працуе на айчынным камбайне — «Палессе GS12». Машыну эксплуатуюць ужо чацвёрты сезон, ніякіх нараканняў на беларускую тэхніку ў хлопца няма.




Падарунак першаму тысячніку Дзяржыншчыны Віталю Куніцкаму ўручыў першы сакратар райкама БРСМ Кірыл Шык.

— Мне падабаецца ў сельскай гаспадарцы, — сцвярджае ён. — Заробак задавальняе, прычым гэта датычыцца не толькі ўборачнай. Мы круглы год атрымліваем добрыя грошы. Іншая справа, на што іх траціць. Дом мы ўжо пабудавалі, дзяцей гадуем, хіба, застаецца толькі сад пасадзіць? А калі сур'ёзна, то цяпер у асноўным клапоцімся пра будучыню сыноў — старэйшаму сем гадоў, малодшаму будзе тры. Для гэтага і працуем.

Да першых тысячнікаў завіталі прадстаўнікі раённай адміністрацыі, Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі, Федэрацыі прафсаюзаў і Цэнтральнай раённай бібліятэкі, якія аддзячылі перадавікам сельскай гаспадаркі за плённую працу, — уручылі каштоўныя падарункі і памятныя падзякі.

— Спаборніцтвы маладых камбайнераў мы праводзім штогод, — расказвае **першы сакратар Дзяржынскага раённага камітэта БРСМ Кірыл ШЫК.** — Лічым, што гэта добра стымулюе нашых хлебаробаў, тым больш, што лідары жніва атрымліваюць каштоўныя падарункі, маюць гонар і пашану ў раёне ад сваіх калег. Вялікай праблемы з кадрамі ў сельскай гаспадарцы, на маю думку, няма. Скажу, што ў нас на Дзяржыншчыне працуе 16 маладзёжных экіпажаў. І гэта без уліку «змешаных», у складзе якіх маладое і старэйшае пакаленні шчыруюць сумесна, — напрыклад, сыны з бацькамі.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*
**Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.**
*Мінск — Дзяржынскі раён — Мінск.*

На сваім месцы

# СПРЫНТ НА ТРАЛЕЙБУСЕ

## Найлепшы кіроўца і горад ведае, і бойкі разнімае

**Пару гадоў таму Ілья МАКЕЙЧЫК падвозіў сябра ў тралейбусны парк, на работу. Сам ён у той час толькі вярнуўся з арміі і шукаў вакансію. Таварыш і прапанаваў: а давай зойдзем спытаем, ці ідзе цяпер набор у кіроўцы? Яны якраз былі патрэбныя. Так Ілья трапіў на работу ў сталічны тралейбусны парк №3. А сёлета ён стаў найлепшым сярод кіроўцаў тралейбусаў на гарадскім конкурсе прафесійнага майстэрства «Мінскі майстар — 2017».**

### Калі дарогі — дзве

...Сёння Ільі ў другую змену, таму ён сустракаецца з намі ў абед, акурат перад выездам. Чаравікі начышчаны, фірменная кашуля адпрасавана. «Мне падабаецца, што ў кіроўцаў ёсць адзіная форма. Але я б яе дапрацаваў. Бо ў гэтай кашулі спякотна», — усміхаецца ён.

Працуе Ілья на маршруце №47. Жартуе, што кіроўцы яго між сабой называюць сацмаршрутам: тралейбус праязджае бальніцу, паліклініку, пункт прыёму другаснай сыравіны. Таму сярод пасажыраў шмат пенсіянераў і тых, хто здае кардон і металалом. Але хутка хлопец пяройдзе на іншы маршрут — №10.

— Мне ён больш падабаецца. На праспекце Пераможцаў пасажырапаток вялікі, продаж талонаў ідзе. А ад гэтага залежыць і мой заробак. Раней кіроўца атрымліваў 12,5 капейкі з кожнага прададзенага талона, цяпер — 25, — расказвае Ілья.

Працоўны стаж хлопца — тры гады, з іх два з паловай — за рулём тралейбуса. Перш чым выехаць на маршрут, будучыя кіроўцы праходзяць паўгадавыя курсы. Спачатку асвойваюць тэорыю ў Мінскім дзяржаўным прафесійным ліцэі №3 машынабудавання, потым — стажыруюцца.

— У нас фактычна дзве дарогі, — заўважае Ілья. — Трэба і перад сабой, і наверх на лінію глядзець. На аўтобусе, думаю, прасцей працаваць. Манеўраваць больш зручна. А мы не можам хуценька рушыць у трэцюю паласу, бо нам не дазволіць лінія.

— Звычайна за рулём тралейбусаў бачыш жанчын...

— У нашым парку іх нямнога. Вось у чацвёртым — шмат. Жанчыны яшчэ дадуць фору некаторым кіроўцам-мужчынам!

У конкурсе прафесійнага майстэрства хлопец удзельнічаў трэці раз. Разам з ім сёлета за званне найлепшага ў прафесіі змагаліся 18 чалавек. Кіроўцам трэба было выканаць пэўныя фігурныя элементы: «тунэльныя вароты», заезд у бокс перадам і задам, пад'езд да прыпынку, «змейку», дыяганальную паркоўку і іншыя. А падчас тэарэтычнай часткі спаборніцтва — адказаць на 30 пытанняў па Правілах дарожнага руху. Ілья справіўся з тэорыяй за 64 секунды! У канцы выбіралі двух кіроўцаў з найлепшымі вынікамі і праводзілі аўта-спрынт. Два тралейбусы напарагонкі праходзілі трасу: хто паказаў лепшую хуткасць і атрымаў менш штрафных ачкоў, той і пераможца.



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Пытаемся пра складанасці ў працы. Ілья адразу называе графік. Першая змена ў кіроўцаў пачынаецца а пятай гадзіне раніцы. На работу дабіраюцца на «дзяжурках» — у парку трэба быць за 20 хвілін да выезду, каб паспець падрыхтаваць тралейбус. А яшчэ прафесія патрабуе пастаяннай увагі, бо ты нясеш адказнасць за пасажыраў. З-за таго што ўвесь час знаходзішся ў напружанні, за змену вельмі стамляешся.

— На дарозе больш за ўсё перашкаджаюць машыны, якія стаяць на прыпынках і не даюць пад'ехаць. У нас у інструкцыі прапісана, што мы павінны спыняцца не далей чым за 20 сантыметраў ад бардзюра. А яшчэ па маім маршруце аўташкола знаходзіцца — пастаянна вучэбныя машыны ездзяць. Прычэпішся за такім аўто (а яно можа два разы заглухнуць), потым даводзіцца наганяць час, каб упісацца ў графік.

Спазняцца кіроўцам нельга, як і апярэджваць расклад — могуць пазбавіць прэміі. Адхіленне ў адну хвіліну дапушчальнае, але, прызнаецца суразмоўнік, бываюць вельмі прыдзірлівыя пасажыры, якія скардзяцца ў парк нават з-за такога спазнення.

### Сіла фірменнай кашулі

Ілья добра ведае Маскоўскі раён. Таму, калі да яго падыходзяць спытаць, як дабрацца па нейкім адрасе, падказвае, дзе выйсці ці на які транспарт перасесці.

— Буйныя пасажыры сустракаліся?

— Бывала. Памятаю, п'яныя хлопцы пачалі ў салоне біцца, а побач — жанчыны сядзяць. Іншых мужчын не было. Давялося ўмяшацца самому. Не, абышлося без кулакоў. Проста сказаў: «Калі ласка, выходзьце, далей тралейбус не паедзе». Тыя хлопцы, убачыўшы на мне форму кіроўцы, нармальна паставіліся і пакінулі тралейбус. Біцца са мной пакуль не лезлі, — усміхаецца суразмоўнік.

— А калі ўбачыш, што нехта бяжыць да тралейбуса, пачакаеш?

— Я ніколі адразу не зачыняю дзверы. Думаю: няхай на хвілінку пазней паеду, але зраблю добрую справу. Бывае, людзі потым махнуць мне, падыдуць і скажуць «дзякуй», — прыемна.

Цікавімся: калі камусьці з пасажыраў стала дрэнна, ці можа кіроўца завезці яго ў бальніцу? «Не. Па інструкцыі мы павінны спыніць транспарт і выклікаць «хуткую». Пасажыры любяць адразу валідол прапаноўваць. Але, мне здаецца, даваць чалавеку таблеткі, не ведаючы, што з ім, небяспечна».

Сам Ілья ў асноўным ездзіць на ўласным аўто. Смяецца, што грамадскага транспарту яму і на рабоце хапае.

Заробак, дарэчы, у маладога кіроўцы прыстойны — 800—900 рублёў.

— Мне прафесія падабаецца. Я яшчэ калі быў маленькі, вельмі цягнуўся да руля. З татам ездзіў — заўсёды хацелася самому кіраваць. Быццам знайшоў сябе. У будучым планую павысіць і свой клас: восенню пайду здаваць на другі. А яшчэ праз год безаварыйнай работы можна першы клас атрымаць. Напэўна, першы клас і перамога ў «Мінскім майстры» — вяршыня для кіроўцы *(смяецца)*.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

# УДЗЕНЬ — БУДОЎЛЯ, УВЕЧАРЫ — МУЗЕЙ



Праз некаторы час тут будуць выхоўваць новае пакаленне беларускіх гімнастак.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Усяго ў склад атрада ўваходзяць чатыры ўкраінцы, столькі ж расіян і два беларусы. Разам з імі на гэтай жа будоўлі працуе студэнцкі атрад з Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта. Нягледзячы на тое, што многія байцы — ужо фактычна дарослыя людзі, фінансавы аспект для іх далёка не на першым плане. Дзяніс Чубаха сцвярджае, што галоўным стымулам для большасці стала магчымасць убачыць суседнюю краіну. Заробак жа залежыць ад аб'ёмаў выкананай работы, арыенціровачная лічба — каля 700 рублёў за месяц.

— Я першы сакратар камсамольскай арганізацыі нашага раёна, — расказвае **Арцём ГЕРМАН, які прыехаў у Беларусь з Первамайска Мікалаеўскай вобласці Украіны.** — Гэтым летам атрымаў запрашэнне ў Мінск на будоўлю і доўга не раздумваў. У вашай краіне ўпершыню, ураженняў вельмі шмат — усяго не раскажаш. Спачатку працаваць было цяжка, але я хутка вучуся, таму цяпер праблем няма. У нас выдатны калектыў — «адзін за ўсіх і ўсе за аднаго». Разам гатуем вячэру, адпачываем. Нядаўна вось гулялі ў футбол на стадыёне побач з інтэрнатам, хадзім на турнікі. Горад вельмі прыгожы. Калі параўноўваць з Кіевам, у нас на вуліцах вельмі шмат лішняга — кіёскаў, рэкламы і іншага, а ў вас я адчуваю сябе спакойна. Увогуле, прызнаюся, што падчас гэтай паездкі задумаўся пра пераезд у Беларусь.

Байцы пераважна займаюцца падсобнай работай. Хлопцы дапамагаюць мулярам, падаюць цэглу і раствор, збіраюць і разбіраюць рыштаванні, прыбіраюць смецце, разгружаюць аўтатранспарт. Некалькі байцоў, у якіх ужо ёсць вопыт работы на будоўлях, працуюць цeслярамі-бетоншчыкамі. Шчыраваць усе плануюць поўны тэрмін — амаль два месяцы. Дарогу ў Беларусь і назад усім аплацілі арганізатары.

— Я ўжо другі раз у будатрадзе, у 2015 годзе таксама працаваў у вас на «Дынама», — расказвае **Уладзімір КУПРЭЙЧУК** з Оўруча Жытомірскай вобласці. — Ад той паездкі засталіся выдатныя ўражанні, таму і вырашыў вярнуцца ў Мінск. Адзінае, чаго хацелася б асабіста мне, — больш актыўнага адпачынку. Па профільнай адукацыі я геадэзіст, але ніколі не сталкіраваўся па спецыяльнасці, таму займаюся ў асноўным падсобнымі работамі. Мяне фізічная праца не палохае, яна ачышчае галаву ад дурных думак *(смяецца)*. Мінск — прыгожы, калі будзе магчымасць, абавязкова вярнуся яшчэ раз.

Байцоў пасялілі ў пятнаццаці хвілінах хады ад будоўлі — у інтэрнаце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта фізічнай культуры. Умовамі пражывання ўсе задаволеныя, тым больш, што ў пакоях хлопцы фактычна толькі начуюць. Што датычыцца работы, то, як кажа Дзяніс Чубаха, на будоўлях ніколі не бывае лёгка. Узвядзенне Цэнтра алімпійскай падрыхтоўкі па мастацкай гімнастыцы ён называе «сур'ёзным праектам». Тут уважліва сочаць за ўсімі дробязямі, вельмі жорстка кантралююць выкананне мер бяспекі.



Мантаж рыштаванняў — нескладаная, але вельмі важная для любой будоўлі работа.

— Раней ніколі не ўдзельнічаў у будатрадах, цяпер вось даганяю, — прызнаецца **настаўнік гісторыі і англійскай мовы адной са школ Разані Уладзімір ГРУШАВОЙ.** — Калі быў студэнтам, трохі падпрацоўваў на будоўлях, таму работа для мяне не новая. Хоць усё адно цяжка прывыкнуць, калі дома нічога цяжэй за ручку не падымаеш. У Беларусі ўпершыню. Калі параўноўваць з месцам, дзе жыву, то Мінск вельмі прыгожы. Першае, што кідаецца ў вочы, — прастора: у мяне позірк адпачывае, і на душы становіцца спакойна. Спадабаўся Верхні горад, трохі гулялі па праспекце, але калі шчыра, то часу на адпачынак няшмат — у асноўным гэта выхадныя. А яшчэ ў вас неверагодныя дзяўчаты! Для мяне гэта паездка — каштоўны досвед, бо можна даведацца шмат карысных рэчаў: як класці цэглу, замешваць раствор — ніякаму мужчыну гэта не будзе лішнім. Фінансавае пытанне таксама прысутнічае, але для мяне яно не галоўнае — я ехаў па ўражанні.

Падчас нашага візіту байцы дапамагалі ўзводзіць калідор, дзе будуць размяшчацца распранальні, душавыя кабінкі, прыбіральні. Адсюль ужо бачныя дзве велізарныя залы, дзе праз некалькі гадоў будуць выхоўваць новых «зорак» айчыннага спорту. Хлопцы манціруюць рыштаванні — не самая цяжкая, але вельмі адказная работа.

— Прыязджаю ў Мінск ужо другі год, — кажа **студэнт Запарожскага нацыянальнага ўніверсітэта Уладзіслаў САХАБУТДЗІНАЎ.** — У Беларусі мне вельмі падабаецца парадак, пачынаючы ад раскладу аўтобусаў, якія прыязджаюць хвіліна ў хвіліну, і заканчваючы сацыяльнай арыентаванасцю дзяржавы. Яшчэ звярнуў увагу, што большасць прадуктаў зроблена ў сваёй краіне — гэта выдатна, бо ў нас усё імпартнае. Працаваць люблю, для мяне гэта не праблема, а тут адначасова можна яшчэ пабачыць іншую краіну. Таму будатрад — проста шыкоўная магчымасць для гэтага.

Для міжнароднага атрада, як заўсёды, распрацавалі культурную праграму. У хлопцаў запланаваны візіты на галоўныя прадпрыемствы горада: МАЗ, МТЗ, завод «Атлант», фабрыку «Камунарка». Не застануцца без увагі і музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і Заіра Азгура. Таксама байцы наведаюць сталічны аквапарк. Адбудзецца футбольны матч з атрадам з Санкт-Пецярбурга, які сёлета працуе на рэканструкцыі «Дынама».

— На практыцы пасля другога курса нам абавязкова трэба папрацаваць на якім-небудзь будаўнічым аб'екце, — тлумачыць **студэнт будаўнічага факультэта Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта Уладзіслаў ГУМЯНЮК.** — У БРСМ прапанавалі спалучыць карыснае з прыемным і пайсці ў будатрад да канца лета, таму я адразу згадзіўся. Дасюль такога вопыту ў мяне не было, але цяпер я ў захапленні. Вельмі ўзрадавала, што з намі працуюць хлопцы з Расіі і Украіны. Мы з усімі ладзім, размаўляем на розныя тэмы, дзелімся меркаваннямі — гэта заўсёды цікава. А яшчэ для мяне важна, што мы ўзводзім сапраўды ўнікальны аб'ект. Я бачыў макет, і ўпэўнены, што будынак будзе нестандартны. Як студэнты профільнай спецыяльнасці, дапамагаем устанаўліваць апалубку, заліваем сцяжку — усё гэта дапаможа нам у будучай прафесіі.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*
**Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.**

*Ахвотныя — у поле!*

## ЗНАЙСЦІ ПОМНІКІ ГІСТОРЫІ

**Добраахвотніцкі археалагічны атрад «Ведрыч» імя прафесара С. Я. Рассадзіна даследуе тэрыторыю вёскі Гагалі Рэчыцкага раёна ў пошуках помнікаў гісторыі.**

У склад археалагічнага атрада ўвайшлі дзевяць добраахвотнікаў, членаў БРСМ — студэнты і магістранты гістарычнага факультэта ГДУ імя Ф. Скарыны. Пад кіраўніцтвам кандыдата гістарычных навук, старшага навуковага супрацоўніка аддзела археалогіі першабытнага грамадства Інстытута гісторыі НАН Беларусі Ігара Язепенкі ў вёсцы Гагалі маладыя людзі дэталёва даследуюць культурны пласт, які адносіцца да IV—III тысячагоддзяў да нашай эры. Да атрада далучыліся і дзесяць школьнікаў з Рэчыцкага раёна.

У вольны ад навуковай работы час удзельнікаў чакае насычаная праграма: экскурсіі па раёне, спартыўныя і культурныя мерапрыемствы.

Археалагічны атрад фарміруецца ў Гомельскай вобласці другі год запар. У жніўні 2016 года яго ўдзельнікі вывучалі помнікі старажытнарускай і старабеларускай культуры ў Горвалі.

Арганізатарамі экспедыцыі выступаюць рэспубліканскі, Гомельскі абласны і Рэчыцкі тэрытарыяльны штабы студэнцкіх атрадаў БРСМ пры падтрымцы Рэчыцкага райвыканкама.

*Было б жаданне*

## Студатрад як школа жыцця

**Пачынаючы з 2003 года, студатрадаўскі рух ахапіў усімі відамі другаснай працоўнай занятасці больш за 975 тысяч маладых людзей. Сёння студэнцкія атрады працуюць на рэканструкцыі і будаўніцтве дарог, школ і дзіцячых садкоў, спартыўных комплексаў, жылых дамоў па ўсёй краіне, збіраюць ураджай, выхоўваюць дзяцей у аздараўленчых лагерах.**

Поўным ходам ідзе работа зводнага беларуска-расійскага студэнцкага атрада на аб'ектах будаўніцтва Беларускай атамнай электрастанцыі (Усебеларуская маладзёжная будоўля); студэнцкіх атрадаў абласных маладзёжных будоўляў: на будаўніцтве аўтамабільнай развязкі ў Брэсце, цэнтральнай раённай бальніцы ў Астраўцы; аперацыйнага блока Магілёўскага абласнога анкалагічнага дыспансера з устройствам рэзервовай кацельні на прыродным газе; добраўпарадкаванні аб'ектаў да Дня беларускага пісьменства ў Полацку і абласнога фестывалю працаўнікоў вёскі «Дажынкі 2017» у Дуброўне, рэканструкцыі дзіцячай абласной клінічнай бальніцы па вуліцы Жаркоўскага ў Гомелі. У сталіцы байцы студэнцкіх атрадаў працуюць на гарадской маладзёжнай будоўлі — будаўніцтве Рэспубліканскага цэнтра алімпійскай падрыхтоўкі па мастацкай гімнастыцы. Для ўдзельнікаў студэнцкіх атрадаў ёсць работа на 1 223 аб'ектах (40 683 працоўныя месцы). Акрамя таго, беларускія студэнцкія атрады працуюць за межамі нашай краіны ў Расійскай Федэрацыі і Польшчы.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
*rs@zviazda.by*

*Свой профіль*

## З РАЗРАДАМ — ЗА СТАНОК

### Навучэнцы машынабудаўнічага каледжа працуюць на МТЗ

**Літаральна днямі атрад імя Героя Савецкага Саюза І. П. Мазурука — адзінаццаць навучэнцаў Мінскага дзяржаўнага машынабудаўнічага каледжа — заняў месцы за станкамі Мінскага трактарнага завода. У першы дзень работы да іх завітаў карэспандэнт «Чырвонкі. Чырвонай змены».**

Тое, што хлопцы атрымліваюць профільную адукацыю і маюць разрады, дазваляе ім працаваць па спецыяльнасці. Усіх удзельнікаў атрада ўладкавалі токарамі і фрэзероўшчыкамі ў механічны цэх №5, дзе ідзе вытворчасць валоў і шасцерняў, з якіх пазней робяць вузлы для трактароў магутнасцю ад 9 да 350 конскіх сіл.

— Скажу шчыра, праца ў студатрадзе для мяне — гэта ў першую чаргу магчымасць трохі падзарабіць, — прызнаецца **навучэнец трэцяга курса спецыяльнасці «тэхналогіі машынабудавання» Мінскага дзяржаўнага машынабудаўнічага каледжа Дзяніс КОРАБАЎ.** — Работа на МТЗ для нас не ў навінку — некалькі месяцаў таму мы ўжо праходзілі ў гэтым цэху практыку, толькі на іншым участку. Таму з вытворчасцю ўжо добра знаёмыя, ды і з хлопцамі адзін аднаго ведаем няблага. Працую на станку глыбокага свідравання — раблю з нарыхтовак валы. Фактычна, выконваю апошнюю аперацыю — свідрую ў іх адтуліны. Вядома, усё выконвае машына, я толькі кантралюю работу камп'ютара. На практыцы было трохі цяжкавата — шум, высокая адказнасць, але з часам да гэтага прывыкаеш. Цяпер ужо адчуваю сябе ў «сваёй талерцы» і працую з задавальненнем. Магчыма, у будучыні прыйду працаваць на МТЗ, але найперш хачу скончыць сваю навучальную ўстанову і паступіць у ВНУ — так болей шанцаў зрабіць добрую кар'еру.

— Я таксама працую ў пятым цэху, — кажа **навучэнец трэцяга курса спецыяльнасці «тэхнік-тэхнолаг» Вадзім АЛЯШКЕВІЧ.** — Спецыяльна прасіўся на тое самае месца, дзе праходзіў практыку, бо для мяне тут ужо ўсё знаёмае — ведаю, як працаваць, якія патрабаванні ў кіраўніцтва. Займаюся вытворчасцю шасцерняў — кантралюю работу станка, які наразае на іх зубцы. Таму не скажу, што гэта цяжка фізічна — проста вымагае высокай канцэнтрацыі. Сам родам са Смаргоні, і для мяне галоўнай матывацыяй для таго, каб запісацца ў студатрад, стала жаданне не сядзець летам у Мінску без справы. Грошы — не галоўнае, хоць прыемна будзе адкласці нешта заробленае ўласнымі рукамі на свае патрэбы. За практыку, напрыклад, атрымаў 350 рублёў — лічу, для навучэнца гэта няблага. Далей планую атрымліваць вышэйшую адукацыю, а вось ці буду працаваць у машынабудаванні, яшчэ не ведаю — паглядзім.

— У асноўным мы бралі студэнтаў старшых курсаў, — расказала **першы сакратар Партызанскай раённай арганізацыі БРСМ Ганна УЛЬРЫХ.** — Адбор быў дастаткова сур'ёзны, і далёка не ўсе ахвотныя трапілі на работу на МТЗ. Атрад будзе працаваць два тыдні. Летась мы змаглі стварыць на базе трактарнага завода два атрады: сэрвісны і педагагічны (апошні быў у адным з дзіцячых лагераў прадпрыемства), але сёлета такой вялікай патрэбы ў кадрах няма. Наогул, у Партызанскім раёне мы сфарміравалі 14 атрадаў агульнай колькасцю каля 200 чалавек. Адзін з іх працуе на Усебеларускай маладзёжнай будоўлі ў Астраўцы, а ў сталіцы хлопцы і дзяўчаты ўладкоўваюцца ў «Мінскводаканал», «Мінскметрабуд», «Зеленбуд» і іншыя дзяржаўныя арганізацыі. Пераважна працуем з сярэднімі спецыяльнымі і прафесійна-тэхнічнымі навучальнымі ўстановамі, бо ў ВНУ створаны ўласныя штабы працоўных спраў.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*

*Крымінальны бізнес*

## СЛЕСАР ПАДПРАЦОЎВАЎ «МІНЁРАМ»

**Супрацоўнікі сталічнага наркакантролю пры падтрымцы байцоў спецпадраздзялення «Алмаз» затрымалі з доказамі злачынства 24-гадовага мінчаніна, які працаваў на інтэрнэт-краму па продажы наркотыкаў і псіхатропаў. Затрыманы і яго прыяцель, які вырашыў набыць для сябе мефедрон і марыхуану.**

Аператыўнікі ўстанавілі, што 24-гадовы мінчанін афіцыйна працаваў слесарам на адной з СТА. Акрамя асноўнай дзейнасці, паспяваў «падпрацоўваць» і ў інтэрнэт-краме па збыце наркотыкаў. На працягу паўгода ён выконваў ролю закладчыка. Таксама прывозіў гашыш, марыхуану, мефедрон з Санкт-Пецярбурга ў Мінск. Варта адзначыць, што менш за месяц таму наркакантроль затрымаў мінчан, якія займаліся распаўсюджваннем псіхатропаў, працуючы на гэтую ж інтэрнэт-краму. Паводле інфармацыі аператыўнікаў, яны з'яўляліся дробнарознічнымі закладчыкамі, а 24-гадовы фігурант — буйным аптавіком (рабіў закладкі па 150 грамаў).

Малады чалавек разам з пакупніком прыехаў у прыватны сектар у Заводскім раёне. Падчас агляду машыны аператыўнікі наркакантролю выявілі і канфіскавалі каля 400 грамаў гашышу, каля 500 грамаў мефедрону і больш за 100 грамаў марыхуаны, прызначаных для рэалізацыі.

*Рука дапамогі*

## ВЫРВАЦЬ З ПАЛОНУ ЗАЛЕЖНАСЦІ

**Галоўнае ўпраўленне па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі МУС сумесна з ГУУС Мінгарвыканкама абвясцілі праект пад рабочай назвай #Наркакантроль.**

Ён прызначаны для аказання дапамогі тым, хто трапіў у палон наркатычнай залежнасці, хоча, але не можа вырвацца з сетак наркаманіі. Даслаўшы (пры жаданні — ананімна) паведамленне аб праблеме ў сферы наркагандлю і нораваў, чалавек можа паспрыяць выкрыццю злачынцаў і спыненню іх крымінальнай дзейнасці.

У рамках праекта прымаюцца паведамленні: пра вядомыя грамадзянам факты вырабу, рэалізацыі і захоўвання наркатычных рэчываў і прэкурсораў; аб асобах, якія допускаюць немедыцынскае ўжыванне наркатычных рэчываў; аб суполках у інтэрнэце, якія рэкламуюць продаж наркатычных рэчываў альбо схіляюць да іх ужывання.

**Аукцион состоится 28 августа 2017 г. в 14.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении; *юридическим лицом резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица; *индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются: представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя - доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя; физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица; представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 21.03.2017 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений – 22 августа 2017 г. до 15.00**

*Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by/*

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ ДЛЯ СТРОИТЕЛЬСТВА И ОБСЛУЖИВАНИЯ ОДНОКВАРТИРНОГО ЖИЛОГО ДОМА В БОБРУЙСКОМ РАЙОНЕ

| Номер лота по порядку | Местоположение земельного участка | Начальная цена (руб.) | Размер задатка (руб.) | Расходы, связанные с подготовкой аукциона и документации, необходимой для его проведения | Условие проведение аукциона | Характеристика земельного участка | Кадастровый номер | Инженерная и транспортная инфраструктура | Дата проведения аукциона | Последний день приема заявлений |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Бобруйский район, Слободковский сельисполком д. Каменка, ул. Октябрьская, 6А | 3791,00 | 379,10 | 1431,40 (+ расходы за рекламу) (расходы возмещает победитель аукциона) | Наличие не менее двух участников | Площадь 0,2500 га | №720883601101000362 | Ограничения в использовании земельного участка – охранная зона линий связи и радиофикации – 0,0082 га. Имеется возможность подключения к централизованному электроснабжению, водоснабжению, газоснабжению, асфальтированный подъезд | 18.09.2017 | 12.09.2017 до 17.00 |
| 2. | Бобруйский район, Слободковский сельисполком, д. Слободка, ул. Затишанская, 2В | 2243,92 | 224,39 | 1406,31 (+ расходы за рекламу) (расходы возмещает победитель аукциона) | Наличие не менее двух участников | Площадь 0,1713 га | №720883606101000214 | Ограничения в использовании земельного участка – водоохранная зона реки Бобруйка – 0,1713 га, охранная зона линий связи и радиофикации – 0,0060 га. Имеется возможность подключения к централизованному газоснабжению и электроснабжению | 25.09.2017 | 19.09.2017 до 17.00 |

**ПРИМЕЧАНИЕ:** Аукцион состоится в 15.30 по адресу: г. Бобруйск, ул. Пушкина, 215-а, 2-й этаж, малый зал заседаний. Заявления принимаются по адресу: г. Бобруйск, ул. Пушкина, 215а, каб. 60, в рабочие дни с 08.00 до 17.00 с 1-го дня после публикации извещения в СМИ.

1. Условия аукциона:

- для участия в аукционе гражданин, юридическое лицо (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) в установленный в извещении срок подают заявление об участии в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков, которые они желают приобрести в частную собственность, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка, а также заключают с местным исполнительным комитетом или по его поручению с организацией соглашение.

Кроме того, в комиссию представляются:

а) гражданином – копия документа, содержащего идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

б) представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц – документ, удостоверяющий личность.

К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию в указанные в извещении сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие задаток (задатки) в размере, порядке и сроки, определенные в извещении, а также заключившие соглашение.

Граждане, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

Участник аукциона имеет право до начала аукциона письменно отозвать заявление об участии в нем. Неявка участника аукциона приравнивается к письменному отзыву заявления об участии в нем. При этом участнику аукциона в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона возвращается сумма внесенного им задатка (задатков).

Контактные телефоны в Бобруйске: (8 0225) 71 74 30, 74 82 94, 72 05 40.

Сведения об участниках аукциона не подлежат разглашению.

2. Перед началом аукциона его участники обязаны зарегистрироваться в комиссии или организации и обменять билеты участников аукциона на аукционные номера, которые возвращаются в комиссию или организацию после окончания аукциона.

3. Шаг аукциона к начальной цене земельного участка – 10%.

4. Сумма задатка перечисляется на расчетный счет Слободковского сельского исполнительного комитета BY35AKBB36007121000140000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, БИК банка AKBBBY2X, УНН 700451296, код платежа в бюджет 04901.

5. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену.

6. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектами продажи в Слободковском сельисполкоме.

7. Продажа земельных участков производится без изменения целевого назначения.

7. Слободковский сельский исполнительный комитет вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 рабочих дня до назначенной даты его проведения.

8. Земельные участки сформированы для проведения аукциона со следующими условиями для победителя либо единственного участника несостоявшегося аукциона:

- в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона победитель аукциона обязан внести плату за вычетом суммы задатка за земельный участок, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участниками документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка;

- в течение двух месяцев со дня подписания протокола о результатах аукциона либо протокола о несостоявшемся аукционе обратиться за государственной регистрацией прав на земельный участок в Бобруйский филиал РУП «Могилевское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» (г. Бобруйск, ул. Пролетарская, 35);

- приступить к занятию земельных участков в соответствии с целью и условиями их предоставления в течение одного года со дня получения свидетельства о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения прав на него;

- получить в установленном порядке архитектурно-планировочное задание и технические условия для инженерно-технического обеспечения объекта строительства, разрешение на проведение проектно-изыскательских работ, обеспечить разработку строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий 1 год;

- после получения разрешения на строительство снять на земельных участках плодородный слой почвы из-под пятен застройки и использовать его для благоустройства участка;

- завершить строительство объекта в сроки, определенные проектной документацией;

- соблюдать права и обязанности землевладельцев, землепользователей и собственников земельных участков, установленные кодексом Республики Беларусь о земле;

- осуществлять всякое строительство, расширение и реконструкцию строений и сооружений в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

SEX=БАЛЯСЫ

# ГАЛАВУ НАПЯКЛО?

**Гэты год (а ён жа яшчэ не скончыўся, чаго чакаць?), бясспрэчна, запомніцца многім і надоўга. Вядома, з-за сёлетніх умоў надвор'я. Мабыць, такой колькасці анекдотаў з гэтай нагоды яшчэ ніколі не нараджалася за адзін раз. Усе ж памятаюць, як пачыналася, як мы чакалі цяпла ўвесну? Не дачакаліся... («Вясну перазімавалі і лета перазімуем! Не на тых напалі».) Была надзея хоць бы ў пачатку лета пабачыць дзяўчат у лёгкіх сарафанчыках, у кароткіх спадніцах. Зноў жа, ага... («Планы на чэрвень? Пакуль не ведаю. У залежнасці ад таго, якая будзе пара года».) Вось ужо многія і ў водпуск схадзілі, а мужчынскае вока на прадстаўніцах прыгожай паловы чалавецтва так і не адпачыла. («Мярзотна-кантынентальны клімат — гэта калі за тры дні ты бачыш вясну, зіму і лета, прычым не выязджаючы за межы свайго горада».) Некаторыя ўжо адчаяліся дачакацца цяпла і эротыкі ў вобразах дзяўчат. («Давайце ўжо ваш верасень, з гэтым летам усё зразумела».) І тут, калі і спадзявацца перасталі, прыйшла яна, спёка... («Прывітанне, лета! Спадзяюся, хоць бы без снегу?»)**

Ведаеце, што асабіста мяне кожны раз некалькі пужае ў гэтай сітуацыі? Калі градус паветра імкліва павышаецца, многім сонца б'е ў галаву ў плане знешняга выгляду. («Чула, што ў стыльнай жанчыны туфлі і машына павінны быць аднаго колеру. Купіла жоўтыя боты, каб да маршруткі падыходзілі».) Зразумела, спякота, хочацца свежага ветрыку, прахалоды, але ж... На вуліцах населеных пунктаў з'яўляецца процьма людзей з такім летнім дрэс-кодам, што часам хочацца за галаву схапіцца. Гаворка не толькі пра дзяўчат, але і пра хлопцаў таксама. («Калі ў спёку хадзіць у трусах, дык надзетая да стала майка ўспрымаецца як поўны парад».)



І ўсё ж найперш «запальваюць» прадстаўніцы прыгожай паловы чалавецтва. Ды часам, прабачце, так... Напрыклад, расійская спявачка Лаліта здзівіла сваіх паклоннікаў незвычайным строем. Падчас выступлення ў Баку яна скінула з сябе накідку і засталася перад залам у... абцягваючым, амаль празрыстым трыко-камбінезоне з эфектам татуіроўкі на скуры. Чым думала? («Гэта была дрэнная ідэя, таму я, канешне ж, вырашыла паспрабаваць».) Усё б нічога, але трэба ведаць пра габарыты спявачкі... («Мужчыны, ніколі не параўноўвайце жанчыну з ланню. Бо, увага, сярэдняя вага самкі лані — 120 кілаграмаў!») Пачуццю гумару і смеласці Лаліты можна толькі пазайздросціць: на выпад Галкіна яна адказала, маўляў, што ў тваёй жонкі знікла, да мяне прыйшло. І далей пра тое, што хоча заставацца на расійскай сцэне самай тоўстай спявачкай. («Я тоўстая толькі таму, што ўва мне жыве адразу некалькі прынцэс».) Схіляю галаву перад самаіроніяй Лаліты, але... Хто сказаў, што гэта было прыгожа? («Скажыце, а вам таксама па начах халадзільнік праходу не дае?»)

Відавочна, усё тая ж спёка паўплывала на знешні выгляд 28-гадовай «зоркі» брытанскіх рэаліці-шоу на адпачынку. Яна з'явілася на публіцы ў ружовай сукенцы, матэрыял якой вельмі нагадваў сетку з-пад мяхоў ад бульбы ці іншай агародніны. Беларусы, уявілі? («А тэма нашага сённяшняга семінара: «Аднаўленне рэпутацыі дзелавой жанчыны пасля навагодняга карпаратыву».) Больш за тое, за мяжой ужо некалькі гадоў у трэндзе купальнікі, у якіх нельга купацца, бо яны са стразамі, вышыўкай, драпіроўкай, пер'ем і г. д. Жыхары мегаполісаў выходзяць у іх на вуліцы, як на пляж. Адзін брэнд прапануе, напрыклад, кідкі купальнік у спалучэнні з блузкай з доўгімі рукавамі з тканіны з тым жа прынтам. (З адэскага гумару. «— Фаечка, такі апішы сябе ў двух словах? — Вой, сябе? У двух словах? На аматара...») Другі брэнд агітуе за купальнік з падабенствам парэа на сцёгнах у спалучэнні з «рымскімі» сандалямі. Дызайнерскі дуэт прапануе насіць купальнік у горадзе з... пухавіком футырыстычна-гатычнага выгляду. («Бачыць вас — адно задавальненне. Не бачыць — другое».)

Але гэта што — купальнік на вуліцы? Вось нядаўна ў цэнтры Кіева можна было сустрэць аголеную жанчыну. Абсалютна голая і босая дзяўчына даволі ўпэўнена хадзіла па праезнай частцы, не звяртаючы ўвагі на машыны, якія ехалі побач. Сонейка галаву напякло? («Мілыя дзяўчаты! Вядома, што кожная сняжынка — асаблівая. Але яны чамусьці не выпендрываюцца з гэтай нагоды».) А ў нас у Мінску яшчэ больш дзіўны выпадак быў. У сацсетках з'явілася фатаграфія хлопца (я ж казаў, і яны таксама «запальваюць») у... ружовай сукенцы. Маўляў, яму так зручна ў спёку — свежа, лёгка. Потым, праўда, высветлілася, што гэта ён насамрэч спрэчку прайграў. («Хлопец не вельмі ўмеў рабіць кампліменты і, будучы не ў самым цвярозым стане, выдаў: «— Мілая, твае вочы, як выхадныя: таксама два».) Мне нават больш сказаць няма чаго з гэтай нагоды... («Вельмі люблю тэлепатыю. Бывае, паглядзіш на чалавека — і ён ужо ведае, куды яму целяпаць».)

Але сапраўдны «хіт» сезона — валасаты... купальнік. Амерыканская кампанія са штата Юта выпусціла гэты прадмет жаночага гардэробу ў выглядзе мужчынскага валасатага торса. Купальнікі амаль цалкам паўтараюць анатомію мужчынскага цела і вырабляюцца ў некалькіх расфарбоўках. У ЗША яны атрымалі папулярнасць, аднак многім занадта натуралістычны элемент адзення падаўся агідным. Тое яшчэ, я вам скажу, відовішча... А дзяўчатам падабаецца! («Насамрэч лягчэй угаварыць ні на што не згодную жанчыну, чым адгаварыць на ўсё згодную».) Такая яна, летняя мода...

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# «CherryVata «абнулілася»...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Творчасць стала менш публічнай, праект быў часткова замарожаны, але не закрыты. Мы нібыта нечага чакалі. Нават займаючыся сольнымі кампазіцыямі, будучы ў адпачынку, я абдумваў новыя рэчы для каманды, разумеў, што душа ляжыць да супольнай працы. Адчуванне гурта на сцэне па энергетыцы вельмі адрозніваецца ад знаходжання сам-насам з публікай.

***— Ужо адбылася канцэртная прэзентацыя альбома, ды і сам дыск вы адразу ж выклалі для бясплатнага праслухоўвання...***

— Зараз не тыя часы, каб абмяжоўваць доступ да музыкі, рабіць яго платным. Тады альбом проста не пачуюць. Людзі не гатовыя аддаваць грошы толькі за тое, каб паслухаць трэкі. Ды і прайшло досыць многа часу з папярэдняга рэлізу. Правілы гульні на рынку змяніліся, таму мы фактычна «абнуліліся». Так, гурт мае пэўную гісторыю, але пра яе амаль ніхто не ведае, моладзь успрымае CherryVata як новы праект. Таму і самі ставімся да гэтага этапу, як да новага жыцця, і стараемся рабіць новую музыку. Мы вельмі хвалюемся, як прымуць альбом ды і нас новых. Канешне, частка ранейшых слухачоў з намі засталася, але іх жыццё, прыярытэты, густы змяніліся. Варта арыентавацца на моладзь, рабіць трэндавую музыку, прыслухоўвацца да таго, што маладыя людзі любяць, але ўсё ж ісці сваім шляхам. Мы — праект некамерцыйны, не ствараем пэўны прадукт у адпаведнасці з патрабаваннямі публікі.

**«Прыйшоў час досыць простых творчых пасылаў. Трэнд сучаснай актуальнай музыкі — даступнасць для слухача».**

***— Вы сказалі пра змену правілаў гульні на музычным рынку. За гэты час стала прасцей ці складаней гурту заявіць пра сябе?***

— Усё проста па-іншаму. Сёння прасцей зусім маладым, пачаткоўцам. Калі з'явіўся праект, можна адразу ж размясціць яго ў інтэрнэце, стварыць суполку ў сацыяльных сетках. Паціху будзе пашырацца твая аўдыторыя. Раней жа для пачатку запісвалі музыку на касету ці дыск. Складана было стартануць, але калі ты гэта зрабіў, працэс творчай актыўнасці, раскруткі быў прасцейшы. Калі мы пачыналі, я з касетамі бегаў па студыях, раіўся з людзьмі, якія ўплывалі на беларускую музыку. Многія адмаўлялі — і гэта было сапраўдным выпрабаваннем на трываласць. Але выхад першага альбома на вядомым лэйбле быў для нас сапраўдным трамплінам: сістэма працавала як гадзіннік. З'явілася мноства інтэрв'ю, публікацый у прэсе, пра нас усе гаварылі. Сёння можна стартануць ярка, а што далей? Слухач мае доступ да мільёнаў трэкаў, і таму вылучыцца вельмі складана. Калі ў цябе няма часу на раскрутку ў адпаведнасці з сусветнымі маркетынгавымі стратэгіямі, напрыклад на стварэнне віруснага відэа, то пратрымацца на хвалі ўвагі будзе вельмі цяжка.



***— А публіка змянілася?***

— Яна, сучасная, мне вельмі падабаецца. Не скажу, што раней публіка была кепскай. Нас заўсёды слухалі інтэлігентныя людзі, сёння іх можна назваць хіпстарамі, і гэта забаўна. Напрыклад, на адзін з нядаўніх канцэртаў прыйшлі толькі два знаёмыя чалавекі, усе астатнія — а іх амаль сотня — былі цалкам новыя слухачы. І я разумею, што яны прыйшлі з-за цікавасці, каб пазнаёміцца. Больш за тое, калі раней на канцэрты трапляла многа выпадковых людзей, то сёння верагоднасць пабачыць на выступленні «не свайго» намнога меншая. Публіка стала больш культурна адукаванай, і гэта выдатна, бо ёсць развіццё. Радуе, што мы ўсё яшчэ можам расварушыць моладзь.

***— Ваша музыка досыць нязвыклая для беларусаў. Я сказала бы, што CherryVata гучыць хутчэй па-еўрапейску...***

— Я сапраўды атрымліваю такія водгукі. Але хутчэй як негатыўныя. Так, адзін партал пісаў, што мы зноў нецікавыя сваім еўрапейскім поглядам на музыку, якой і так сёння многа. Раней жа CherryVata была больш яскрава заўважная ў беларускай музычнай прасторы. Гістарычна склалася так, што ў нашай краіне рок, больш ці менш андэграўндны, развіваўся намнога больш актыўна, чым электронная музыка. І якасны рэліз «электроншчыны» быў сапраўдным поспехам. Тады мы аб'ядналі ўсіх і занялі сваю нішу, сталі цікавымі. Зараз жа электронных праектаў больш, і яны не надта адрозніваюцца ў залежнасці ад нацыянальнасці выканаўцаў. Я нават не вылучаў бы асобна беларускую і еўрапейскую музыку ў гэтым сегменце. Так, можна вылучыць тыповыя амерыканскія, нямецкія, англійскія, японскія з'явы, а Еўропа, постсавецкая прастора, з пункту гледжання творчага складніка, не надта адрозніваюцца. Проста за мяжой больш развітая інфраструктура, і музыканты маюць шырэйшыя магчымасці зарабіць і, адпаведна, укласці сродкі, наняць добрых спецыялістаў. У Беларусі маем справу часцей з музычнымі самародкамі, вельмі таленавітымі, але з-за адсутнасці вопыту і пэўнай культуры створаны імі іх прадукт можа прайграць.

***— Магчыма, гэтае імкненне сцерці межы, пазбавіцца ад лішніх эксперыментаў з электронным гучаннем ад таго, што і музыканты, і слухачы нагуляліся ў постмадэрнізм, дзе ўсё было, як лабірынт, заблытана, як канструктар, раздроблена?***

— Так. Прыйшоў час досыць простых творчых пасылаў. Трэнд сучаснай актуальнай музыкі — даступнасць для слухача. Я не скажу, што нашы трэкі ў выніку атрымаліся вельмі простыя, мы не настолькі крутыя, каб нас слухаў увесь свет *(смяецца)*. Створана многа галаваломак. Раней, яшчэ ў пачатку 2000-х, гэта было папулярна і цікава, дзіўныя назвы і вокладкі альбомаў былі звычайнай рэччу. Усе стаміліся. Таму ў новым альбоме CherryVata кампазіцыі досыць простыя, я іх напісаў, калі сядзеў на беразе мора ўначы. Бачыў толькі ваду, месяцавую дарожку, усход сонца. Я не ставіў задачу зрабіць нешта складанае: адсюль і назва альбома, і колеравая гама яго вокладкі. Усё проста, нават мінімалістычна.




***— Падаецца, што CherryVata для вас — як хобі, справа, якой займаецеся, калі адпачываеце?***

— «У галаве» гэта занятак усяго жыцця. Але на справе — хобі, бо праект па-за асноўнай працай. Калі будзе магчымасць займацца толькі музыкай, то я буду шчаслівы. Пакуль жа CherryVata адведзены толькі начны час: тады і спакайней, і больш натхнення для творчасці.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
*vesialuha@zviazda.by*

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве
«Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 20.008.
Нумар падпісаны ў 19.30 16.08.2017 г.

## МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

# ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎСТАНОВА «ШЧУЧЫНСКІ ЗАНАЛЬНЫ ЦЭНТР ГІГІЕНЫ І ЭПІДЭМІЯЛОГІІ»

**ДУ «Шчучынскі занальны цэнтр гігіены і эпідэміялогіі» ажыццяўляе наступныя віды дзейнасці:**

- гігіенічная і эпідэміялагічная ацэнка ўмоў пражывання, працы і побыту насельніцтва, вытворчасці і рэалізацыі харчовых прадуктаў, тавараў, распрацоўка і абгрунтаванне гігіенічных нарматываў;
- гігіенічнае выхаванне і навучанне дэкрэтаваных кантынгентаў;
- дэзынсекцыйныя работы (паслуга);
- дэзынфекцыйныя работы (паслуга);
- дэратызацыйныя работы (паслуга);
- імуналагічная лабараторная дыягностыка;
- кансультацыі па пытаннях забеспячэння санітарна-эпідэміялагічнага дабрабыту насельніцтва і здаровага ладу жыцця;
- мікрабіялагічная лабараторная дыягностыка;
- паразіталагічная лабараторная дыягностыка;
- правядзенне санітарна-гігіенічных, таксікалагічных, мікрабіялагічных і малекулярна-біялагічных даследаванняў;
- санітарна-гігіенічная і эпідэміялагічная экспертыза перадпраектнай, праектнай, нарматыўнай і эксплуатацыйнай дакументацыі.



Галоўны дзяржаўны санітарны ўрач Шчучынскага раёна Гродзенскай вобласці — галоўны ўрач дзяржаўнай установы «Шчучынскі занальны цэнтр гігіены і эпідэміялогіі» ВОЛЧАК Павел Станіслававіч.



САСНА Аксана Віктараўна, фельчар-лабарант санітарна-гігіенічнай лабараторыі, праводзіць тытраванне.



ПІЛІПКА Ала Мікалаеўна і МАТУКЕВІЧ Наталля Уладзіміраўна, медыцынскія дэзынфектары, праводзяць апрацоўку тэрыторыі.



ВІШНЯК Галіна Іванаўна, памочнік урача-эпідэміёлага (загадчык аддзялення) аддзялення прафілактычнай дэзынфекцыі, праводзіць фасоўку атруты-прынады.



САРОКА Вольга Віктараўна, фельчар-лабарант бактэрыялагічнай лабараторыі.



ДАРАШКЕВІЧ Марыя Уладзіславаўна, энтамолаг, вызначае колькасці кляшчоў на флагакіламетр.



ШАНЧУК Зоя Фёдараўна, памочнік урача-эпідэміёлага, праводзіць агляд дзяцей у дзіцячым садку.



ВАСЮК Людміла Станіславаўна, памочнік урача-эпідэміёлага, бярэ змывы.

**Адрас: 231513, Гродзенская вобл.,
г. Шчучын,
вул. Мічурына, 26.
Тэлефон: +375 1514 24271.
Факс: +375 1514 24271.
E-mail: info@shcge.by.**

УНП 500017619



ЛЕМЯНОЎСКАЯ Іна Мікалаеўна, урач-лабарант санітарна-гігіенічнай лабараторыі, праводзіць замеры шуму.




МАТУКЕВІЧ Станіслаў Станіслававіч, кіроўца аўтамабіля.



ВАЯВОДЗІНА Святлана Міхайлаўна, інструктар-дэзынфектар, праводзіць апрацоўку памяшкання.

# АНАТАМІРАВАННЕ ПАКАЖА




## Якія таямніцы высвятляе судова-медыцынская экспертыза?

**Рэдкі дэтэктыўны твор або серыял абыходзіцца без уключэння ў сюжэт судова-медыцынскай экспертызы. Яно і не дзіўна — безліч злачынстваў звязаны з пашкоджаннямі цела. Сёння мы зазіраем па іншы бок гэтых даследаванняў. Аб ім карэспандэнту «Звязды» расказаў намеснік начальніка ўпраўлення судова-медыцынскіх экспертыз Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз па горадзе Мінску Уладзімір СЕМЯНКО-БАЯРЫНЦАЎ.**

— Амаль 100 працэнтаў так званых крымінальных экспертыз звязаны з ужываннем алкаголю. Класічная сітуацыя — некалькі чалавек сабраліся кампаніяй пасядзець. Адвечны «спадарожнік» такіх пасядзелак — моцныя напоі. Падчас размоў за лішкам спіртнога пачынаюць вылазіць старыя крыўды. Пад рукой аказваецца нож. Нядаўнія сябры зводзяць рахункі. Зачастую нажавое раненне бывае ўсяго адно. Але па законе подласці яно прыходзіцца або ў сэрца, або ў аорту. І паранены памірае на месцы.

***— Як доўга праводзіцца экспертыза? Па законе гэты тэрмін не перавышае 30 дзён...***

— Так. Мы залежым ад нашых «сумежнікаў» — судова-гісталагічных, хімічных даследаванняў. Напрыклад, асаблівасць гісталагічнай экспертызы — аналізу тканак цела — у тым, што тэхналагічны працэс ідзе не менш за два тыдні. Скараціць гэты тэрмін тэхнічна немагчыма.

Як прыклад, даволі шмат даводзіцца рабіць экспертыз, звязаных з атрыманнем траўмаў у грамадскім транспарце. Па заканадаўстве там могуць быць выплачаны страхавой кампаніяй істотныя грошы. І наша задача — высветліць ступень цялесных пашкоджанняў. Да таго ж эксперт мае права суадносіць іх цяжкасць і тэрмін знаходжання на бальнічным лісце.

***— Як часта даводзіцца рабіць эксгумацыі?***

— Раней іх было вельмі шмат. Выпадак, які запомніўся больш за астатнія, здарыўся каля 10 гадоў таму. Фельчар выдаваў фіктыўныя пасведчанні аб смерці. Шэраг пенсіянераў былі пахаваныя па такіх непраўдзівых даведках. Справа ў чым: калі чалавек памірае, то на месца падзей выязджае хуткая дапамога і міліцыя. Урачы аглядаюць цела на наяўнасць пашкоджанняў, а міліцыянер праводзіць першасную праверку, апытваючы суседзяў і сваякоў. Калі па аб'ектыўных даных падстаў для хвалявання няма, то паліклініка мае права выдаваць пасведчанне аб смерці без анатаміравання. Вось толькі ў той справе з фельчарам эксгумацыя паказвала, што пенсіянеры былі насамрэч забітыя.

***— Наколькі праўдзівая фраза «анатаміраванне пакажа»?***

— На 100 працэнтаў. Колькі разоў выязджалі на месца здарэння, дзе быў знойдзены труп. Ляжыць цела, усё ў кровападцёках, на галаве — выцятыя раны. Першая ж думка — яго вельмі моцна збілі. А на анатаміраванні становіцца ясна, што жыццёва важныя органы не закранутыя гэтымі ўдарамі. А чалавек памёр насамрэч ад атручэння алкаголем.

Зрэшты, такога аднаснага хэпі-энду перыядычна і не бывае. Прыходзіць да нас нейк малады чалавек. І кажа — дайце пасведчанне аб смерці. Я пытаюся — а навошта яно вам? Хлопец увесь у слязах кажа — бабуля памерла. Я гавару, што мы не выдаём пасведчанне аб смерці, бо можам гэта рабіць толькі на падставе анатаміравання. Юнак у адказ — а што мне рабіць, калі паліклініка не хоча выдаваць? Справа падалася нейкай цьмянай. Таму праваахоўныя органы далі дабро на анатаміраванне. Звонку здавалася, што бабуля памерла сваёй смерцю. А ў выніку аказалася, што ўсе рэбры пераламаныя. Знайшлі разрыў кішэчніка, разрыў селязёнкі... Вывад — смерць насамрэч траўматычная! Пасля высветлілася, што гэты самы ўнук і нанёс такія пашкоджанні. Менавіта таму дасведчаны эксперт не будзе ўстанаўліваць прычыну смерці выключна па вонкавых прыкметах.

Сярод некрымінальных прычын смерці лідзіруюць сардэчна-сасудзістыя захворванні. Гэта ішэмія, кардыяміяпатыя, гіпертанія... Прычым прыведзеная статыстыка актуальная не толькі для Беларусі, але і для ўсяго свету.

***— Якая экспертыза вам запомнілася больш за іншыя?***

— У пачатку 2000-х гадоў да нас у Беларусь прыехаў жыхар Масквы. Ён звярнуўся ў нашу буйную страхавую кампанію. У той час калі сярэдні заробак складаў $60—65, ён застрахаваў сябе адразу на 5 тысяч долараў. Пасля гэтага праз некаторы час з'ехаў у Маскву. Але не назаўсёды — неўзабаве прыязджае назад у Мінск і прывозіць з сабой амбулаторную картку. А там напісана, што ў яго чэрапна-мазгавая траўма. Прычым з вельмі сур'ёзнымі наступствамі, сярод якіх было нават звужэнне палёў зроку. Масквіч паехаў да нашых страхаўшчыкоў — маўляў, давайце плаціце. Тыя, разгледзеўшы паперы, прыйшлі ў стан шоку. І не дзіўна — на першым часе яны мусілі выплаціць каля 10 тысяч долараў! Праўда, звярнуліся яны да нас не адразу. За гэты час па дагаворы набегла няўстойка, пеня, масквіч наняў адваката... І сума ўжо дасягала астранамічных для тых часоў 100 тысяч долараў.

Пасля таго як страхавая кампанія звярнулася па нашу дапамогу, экспертызу даручылі мне. І вось адчуваю: падманвае нахабна чалавек. Але як гэта даказаць? Нейраафтальмолагі з 9-й бальніцы высветлілі, што чалавек сімуляваў і згубу зроку, і чэрапна-мазгавую траўму. Тут жа закруцілася крымінальная справа. Следчыя органы Беларусі выйшлі на паліклініку ў Маскве, якая паставіла непраўдзівы дыягназ. Пасля аказалася, што ўрач таксама быў замяшаны ў гэтай справе — пра выпадковасць гаворкі і не было. Як высветлілася, у Беларусь прыехаў ашуканец са стажам. Ён вандраваў па краінах Садружнасці Незалежных Дзяржаў і «зарабляў» вялікія грошы на такіх страхоўках. Але ў Беларусі, на шчасце, яго крымінальны шлях скончыўся.

***— Чым адрозніваецца праца судмедэксперта ад працы патолагаанатама?***

— І яны, і мы высвятляем прычыну смерці чалавека. Але ў нас вельмі моцна адрозніваецца кантынгент. Да патолагаанатамаў на стол трапляюць целы з лячэбных устаноў з негвалтоўнай прычынай смерці. Разам з імі прыходзіць гісторыя хваробы з выкладкай усіх аналізаў і даследаванняў. А ў судова-медыцынскі морг паступаюць целы з гвалтоўнай прычынай смерці або з падазрэннем на яе. І, як правіла, — мы першапачаткова не ведаем аб іх нічога. Таксама мы працуем з людзьмі, якія памерлі па-за межамі лячэбных устаноў ці на працягу сутак знаходжання ў ёй, нявысветленымі асобамі і тымі, хто ў бальніцу трапіў з нанесенымі цялеснымі пашкоджаннямі.

***— Як гэтая прафесія змяняе чалавека?***

— Я стаў больш міласэрны. Напрыклад, я не здолеў бы працаваць у рэанімацыі, дзе на тваіх руках можа памерці чалавек. Паверце, гэта куды страшней у параўнанні з нашай працай. Акрамя таго, судовы медык мусіць валодаць ведамі практычна ва ўсіх галінах медыцыны. Вось возьмем для прыкладу хірургію. Яна ж дзеліцца на шмат галін — таракальную, сасудзістую, афтальмалагічную, нейрахірургію... А судовы эксперт усяго адзін. Вось перад ім — траўма вока, вось — траўма жывата. І высвятляй, ці прывялі яны да нейкіх наступстваў. І да таго ж эксперт за кожнае слова да апошняй літары высноў нясе крымінальную адказнасць. Усяго ж за мінулы год нам давялося правесці больш за 16 тысяч даследаванняў.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

*schklennik@zviazda.by*

■



**ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении аукциона на право заключения договоров аренды земельных участков**
**Арендодатель – Свислочский районный исполнительный комитет**

| № п/п | Местонахождение участка | Кадастровый номер, площадь и срок аренды | Начальная цена, руб. | Сумма задатка, руб. | Расходы по подготовке (без учета стоимости опубликования извещения), руб. | Целевое назначение | Инженерная инфраструктура |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
| 1 | г.п. Порозово, ул. Социалистическая, У-1 | № 425255700001000218 0,0060 га 10 лет | 64 р. 8 к. | 6 р. 41 к. | 59 р. 90 к. | Для размещения объектов розничной торговли | Существует возможность подключения к сетям: электричество, водоснабжение, с условиями |
| 2 | г.п. Порозово, ул. Ленина, У-503 | № 425255700001000545 0,0029 га 10 лет | 30 р. 97 к. | 3 р. 10 к. | 30 р. | Для размещения объектов розничной торговли | Существует возможность подключения к сетям: электричество, водоснабжение, с условиями |
| 3 | г. Свислочь, ул. Гагарина, У-727 | № 425250100001002151 0,0031 10 лет | 46 р. 73 к. | 4 р. 68 к. | 54 р. | Для размещения объектов розничной торговли | Существует возможность подключения к сетям: электричество, газоснабжение, водоснабжение, канализация, с условиями |
| 4 | г.Свислочь, ул. Цагельник, У-197 | № 425250100001001753 0,0046 га 10 лет | 94 р. 79к. | 9 р. 48 к. | - | Для размещения объектов розничной торговли | Существует возможность подключения к сетям: электричество, газоснабжение, водоснабжение, канализация, с условиями |

**Условия, связанные с формированием земельных участков:**
в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона победитель аукциона или единственный участник несостоявшегося аукциона обязан внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы в случае предоставления рассрочки ее внесения), возместить затраты на организацию и проведение и выполнить условия, предусмотренные в решениях о формировании земельных участков для проведения аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка.

**Примечание:**

1. Аукцион состоится в **10.00 27 сентября 2017 года** в зале заседаний райисполкома по адресу: г. Свислочь, ул. Ленина, 2.

2. Для участия в аукционе необходимо в срок **до 17.00 25 сентября 2017 года** представить следующие документы:
- заявление на участие в аукционе;
- заверенные банком копии платежных поручений, подтверждающих внесение суммы задатка на счет ГУ МФ РБ BY42AKBB36005240001420000000, открытый в ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК банка AKBBBY2X, УНН 500563252, код платежа 04002;
- гражданам – копии документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;
- индивидуальным предпринимателям – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;
- представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенную доверенность;
- представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;
- представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;
- представителем иностранного гражданина – легализованную в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

3. Порядок проведения аукциона определяется Положением о порядке организации и проведения аукционов по заключению договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. №462.

4. Условия проведения аукциона – наличие не менее двух участников.

5. Шаг аукциона к начальной цене земельного участка – 10%.

6. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с земельными участками в натуре.

7. Заявления на участие в аукционе с необходимыми документами принимаются по адресу: Гродненская область, г. Свислочь, ул. Ленина, 2, каб. №1 с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (выходные дни – суббота и воскресенье) до **17.00 25 сентября 2017 г.**

8. Контактные телефоны: 8 (01513) 34629, 32676. Сайт райисполкома www.svisloch.grodno-region.by.

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА**

**по продаже права заключения договора аренды недвижимого имущества**

**Организатор аукциона:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 42-61-62.

**Продавец:** транспортное республиканское унитарное предприятие «Витебское отделение Белорусской железной дороги» (Витебская дистанция гражданских сооружений), г. Витебск, ул. Космонавтов, 10, тел. (0212) 37-81-85

Лот №1. Право на заключение договора аренды сроком на 3 года нежилых помещений площадью 222,0 кв. м, расположенного на 1-м этаже капитального строения (административное здание (хозяйственный блок СПК) с инв. №200/С-54277 по адресу: г. Витебск, ул. Карла Маркса, 4 для размещения станции технического обслуживания и диагностики автомобилей, офисные помещения. Ежемесячный размер арендной платы 106,56 базовых арендных величин. **Начальная цена**: 843,60 руб. **Задаток:** 84,36 руб.

**Дата, время и место проведения аукциона:** 19.09.2017 в 15.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатка и подачи документов:** с 17.08.2017 с 8.30 по 18.09.2017 до 17.30

